ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 61 (4313)
СЕРАДА, 16 сакавіка 1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Падрыхтоўцы да веснавой навігацыі — бальшавіцкія тэмпы. — ГАРТ—СВІД — На могілках Хай-Гейт. — Б. СІДАРОВІЧ І В. ВАСЮКОВІЧ — 6 умоў тав. Сталіна — ва ўсе зьвеньні транспарту (3-я стар.). Павышэньнем вытворча-арганізатарскай ролі рабкораў і нізавога друку сустракаем VII зьезд прафсаюзаў. Зацяжка ільназагатовак — тормаз у падрыхтоўцы да сяўбы. 5 млн. пралетараў дэманстравалі сваю гатоўнасьць да барацьбы за рэвалюцыйнае вызваленьне Германіі. Адкрыўся VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў (1-я стар.).

Арганізацыя вытворчых брыгад і датэрміновая ссыпка насеньня — баявая задача вясковых партарганізацый. Падрыхтоўка да сяўбы і задачы краявых газэт (з лісту культпропу ЦК УсеКП(б) (2-я стар.).

Забясьпечыць кватэрамі рабочых-тарфянікаў. Множыць дасягненьні дэкадніка праверкі ліквідацыі няпісьменнасьці (3-я стар.).

Польскія гарнякі трымаюцца стойка. Новы ўздым забастовачнай барацьбы ў Гішпаніі. Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4-я стар.).

ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ НАВІГАЦЫІ—БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

Валізарны рост сацыялістычнага будаўніцтва прад'яўляе павышаныя патрабаваньні да транспарту, у тым ліку і рэчнага. У бягучым годзе па ўсім СССР грузазварот на водных шляхах вызначан плянам па 31 проц. больш, чым у мінулым годзе. Па рэках БССР павінна быць перавезена 690 тысяч тон грузаў — на 53 проц. больш, чым летась.

Рэчны транспарт да гэтага часу зьяўляўся вузкім месцам народнай гаспадаркі. У вядомай адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у лютым 1931 г. адзначалася: **«Рост народнай гаспадаркі патрабуе ад рэчнага транспарту карэннай перабудовы яго работы ў адпаведнасьці з тэмпамі разгорнутай сацыялістычнай рэканструкцыі».**

Некаторы зрух у рабоце рэчнага транспарту ёсьць, аднак, да пералому яшчэ далёка. Досыць паказаць на тое, што па Дняпра-Дзьвінскім басэйне плян перавозак леташняй навігацыі, які быў прызнан ЦКК-НК РСІ перапамешаным, выкананым толькі на 60 проц., каб уняць адставаньне рэчнага транспарту.

Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б па дакладу кіраўніцтва Дняпра-Дзьвінскага пароходзтва адзначыў: **«рэчны транспарт не скарыстаў усіх магчымасьцяй у бягучай навігацыі і пленум заістаецца самым адсталым участкам народнай гаспадаркі БССР».** Асноўная прычына гэтага ў тым, што органы воднага транспарту яшчэ не перабудавалі сваёй работы на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, што была дрэнная падрыхтоўка да адкрыцьця навігацыі, позьняе заключэньне ўмоў з клієнтурай, слабая падвозка грузаў да прыстаняй, недагрузка і няправільнае скарыстаньне флёту, слабае апэрацыйнае кіраўніцтва і г. д.

Як стаіць справа з падрыхтоўкай флёту да выхаду ў першы рэйс у гэтым годзе?

Суднарамонт — асноўнае зьвяно падрыхтоўкі. Треба сказаць, што ў гэтай галіне праведзена здавальняюча. Скончан у асноўным суднарамонт па Бабруйскім і Гомельскім кіраўніцтвах рэчнага транспарту (апрача знадворнай афарбоўкі і інш. дробных работ). Горш у Віцебску — там суднарамонт праведзен толькі на 90 проц.

Треба мабілізаваць максымум сіл, каб у бліжэйшыя дні цалкам **скончыць суднарамонт,** прычым карэнным чынам **палепшыць якасьць яго.**

Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў давесьці трансфінплян да гаспадарчых адзінак за месяц да адкрыцьця навігацыі. Гэта дырэктыва ў большасьці ня выканана. Кіраўніцтва віцебскага рэчнага транспарту атрымала ад Дняпра-Дзьвінскага пароходзтва трансфінплян толькі ў другой дэкадзе лютага. У выніку, апрача віцебскай ні па адной прыстані не пачалася прапрацоўка пляну.

Паўтараецца леташняя гісторыя ад пягненьня кліентурай заключэньня дагавароў, на патрэбныя грузаперавозкі. Ня гледзячы на тое, што тэрмін заключэньня дагавароў скончыўся 20 лютага, да гэтага часу большасьць грузаперавозак імі не афармлена. На 8 сакавіка заключана дагавароў толькі на 272.000 тон грузаў. Па Гомельскім рэчным флёце з 14 асноўных кліентаў воднага транспарту заключылі дагавары толькі 8. Нельга не адзначыць недапушчальнай тэндэнцыі Лесбелу зьменшыць плян перавозак супроць мінулага году на 37 проц. ЦКК-НК РСІ своячасова выявіла гэта і прымусіла Лесбел заключыць дагавары не па 137 тысяч тон, як гэтага ён хацеў, а па 274 тысячы тон.

У Віцебску заключаны дагавары толькі па 79 проц. грузаперавозак, у Бабруйску — на 53,5 проц.

Уся адказнасьць за насьпяховае праведзеньне заключэньня дагавароў кладзецца на кліентуру і на кіраўніцтва рэчнага транспарту. Треба адзначыць, што ў радзе месць і кіраўніцтва рэчнага флёту нядбайна адносіцца да заключэньня дагавароў, ня прымае мер, каб своячасова іх заключыць. Кіраўніцтва Дняпра-Дзьвінскага пароходзтва таксама позна разаслала тыповыя дагавары (Віцебск атрымаў у канцы лютага), што перашкаджала своячасоваму іх афармленьню.

У мінулым годзе, з прычыны дрэннай арганізацыі пагрузачна-разгрузачных работ, былі вялікія прастоі суднаў. І ў гэтым годзе нічога ня зроблена, каб папярэдзіць прастоі. Фактычна ніякай мэханізацыі не праведзена. Не набрана рабочая сіла (Віцебск, Бабруйск).

Пытаньне **матар'яльна-бытавога абслугоўваньня воднікаў** яшчэ не займае патрэбнай увагі водніцкіх арганізацый. Трэба карэнным чынам палепшыць работу водніцкай каапэрацыі, больш цікавіцца «дробязямі» быту.

Самы слабы вучастак рэчнага транспарту — гаспадарчы разрахунак. Ён фактычна адсутнічае на ўсіх прыстанях і майстэрнях. Творчы энтузіязм рабочых, які выяўляецца ў арганізацыі гаспадарча-разрахункових брыгад, часта не знаходзіць патрэбнага падтрыманьня з боку кіраўніцтва рэчнага транспарту. У Віцебскай майстэрні арганізавалася першая гаспадарча-разрахункова брыгада. Яна паказала ўзоры бальшавіцкай работы. Атрыманае заданьне на 722 чалавекагадзіны за 328 руб., яна выканала ў 453 чалавека-гадзіны за 219 руб. Брыгада дабілася павышэньня прадукцыйнасьці працы на 59 проц., мае 23,6 проц. эканоміі матар'ялу і г. д. Арганізацыі віцебскага рэчнага транспарту не зрабілі гэты ўзор ударнай работы здабыткам усіх воднікаў.

Зусім слаба яшчэ працоўная дысцыпліна сярод воднікаў, не разгорнута і масавая работа. «Моцна і дружна возьмемся за ўздым працдысцыпліны, за паляпшэньне якасьці работы, за стварэньне чыстага пралетарскага быту на суднах. Абвесьцім жорсткую барацьбу супроць гультаёў і разгільдзяяў, супроць рвачоў і працуючых спусьціўшы рукавы, супроць п'яніц, пахабнікаў і чужых пралетарыяту элемэнтаў» (Паркамвод **Янсон**).

Чарговая перамога сацыялістычнай індустрыялізацыі — пуск Дняпрабуду — ставіць перад кіраўніцтвам Дняпра-Дзьвінскага басэйну рад дадатковых адказьнейшых задач па пашырэньні судаходзтва Дняпра. Неабходна пабальшавіцку ўзяцца за рэалізацыю іх. Треба фарсаваць тэмпы пабудовы гомельскага парта, треба навысіць тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі рэчнага транспарту.

Задача партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый рэчнага флёту — пры бліжэйшай дапамозе тэрытарыяльных месцовых арганізацый па-бальшавіцку выкарыстаць апошнія дні перад адкрыцьцём навігацыі, зрабіць іх штурмавымі, наладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва ўсёй работай. Да веснавой паводкі флёт павінен выйсьці ва ўсеўзбраеньні.

Усебеларускі сталінскі паход фабрычна-заводзкага друку

Павышэньнем вытворча-арганізатарскай ролі рабкораў і нізавога друку сустракаем 7 зьезд прафсаюзаў

Замацаваць першыя посьпехі!

Работа па сталінскаму паходу-спаборніцтву нізавога фабрычна-заводзкага друку па камбінаце імя X кастрычніка і фанэрным заводзе (Рэчыца) пачалася 28 лютага. Партыйны камітэт камбінату распрацаваў канкрэтныя мерапрыемствы па кіраўніцтве паходам. Пры рэдакцыі шматтыражкі «Штурмоўка» арганізован штаб паходу.

26 зьменных цэхавых насьценгазэт і чатыры брыгадныя заключылі паміж сабою дагавары на сацыялістычнае спаборніцтва. 13 зьменных і 4 брыгадных насьценгазэты ўжо разгарнулі значную работу. За час паходу яны дабіліся замацаваньня штодзённага выхаду.

Шматтыражка праведзен рэйд па праверцы станоўішча рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна і падрыхтоўцы да зьезду прафсаюзаў. У рэйдзе ўдзельнічала 16 брыгад друку. Вынікі рэйду зьмешчаліся ў насьценгазэтах. Шматтыражка арганізавала некалькі брыгад па праверцы становішча бытавых умоў рабочых, а таксама для вывучэньня работы гаспадарчага кіраўніцтва страгальнага цэху, дзе з гэтым справа абстаіць найбольш дрэнна.

За час паходу шматтыражка «Штурмоўка» выпусьціла 3 нумары газэты, якія прысьвечаны рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Значных посьпехаў за час паходу дасягнулі і штодзённікі. Штодзённка клейкі «б», строгальнага «в» і брыгадныя газэты імя 1040 — эціхіроўкі «б» маюць дасягненьні ў барацьбе з абязьлічкай, з ня якучасьцю рабочай сілы, за правільную арганізацыю працы.

У выніку праведзенай работы па паходу ёсьць і дасягненьні ў выкананьні прамфінпляну па камбінаце. Калі ў студзені і ў лютым мы мелі выкананьне прамфінпляну 91-93 проц., то ўа дня ўключэньня ў сталінскі паход плян выконваецца на 99 проц., а апошняя пяцідзёнка дала 102 проц. Разгорнута пераазаключэньне брыгадных гаспадарча-разрахункових дагавароў. Арганізавана 8 новых ударных брыгад.

Усе цэхі фанэрнага заводу, за выключэньнем клеевых фальцаў і сушыльнага цэху, пераведзены на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну. Значныя дасягненьні ёсьць і ў ліквідацыі абязьлічкі. Уся гэта работа спрыяла выкананьню прамфінпляну заводу. Прамфінплян за студзень выкананы на 100,26 проц., экспартны плян — 121,99 проц., за люты — на 99,64 проц., экспартны плян — на 116,84 проц., а першая пяцідзёнка сакавіка дала агульнае выкананьне пляну на 107 проц.

Газэтай «ШТУРМОЎКА» ў падшэфны Ровенска-Слабодзкі сельсавет былі накіраваны брыгады тэрмінам на 10 дзён. У калгасах гэтага сельсавету арганізован штодзённы выпуск газэты, арганізован рэйд па праверцы рэалізацыі 6-ці ўмоў т. Сталіна і праверана работа па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Новік, Юрчанка і Майсеенка.

Замест 22—60 насьценгазэт

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі нізавы друк і рабкоры Бярэзінскага камбінату (Барысаў) разам з прафсаюзнай арганізацыяй разгарнулі вялікую работу па сталінскім паходзе-спаборніцтве. Умовы і задачы паходу папулярызаваны праз сходы рабкораўскага актыву сумесна з рэдактарамі насьценгазэт і штодзённак, праз цэхавыя сходы рабочых і г. д.

Па ўсіх цэхах і зьменах праведзены рэйды па праверцы рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна. Вынікі рэйдаў абгавораны на сходах рабочых, дзе ўносіліся канкрэтныя прапановы — дадаткі для хутчэйшага зьніщэньня абязьлічкі, ураўнілаўкі і наладжаньня тэхвучобы.

За час сталінскага паходу ўзрос лік штодзённак і насьценгазэт. Да ўключэньня ў сталінскі паход на камбінаце налічваліся 22 насьценгазэты, а сёньня — каля 60. Рэдакцыя газэты «Чырвоны бярэзінец» выдала 4 бюлетэні «За права на рапарт», прысьвечаныя сталінскаму паходу 29 лютага выпуск спэцыяльны нумар «Чырвонага бярэзінца».

Штаб па правядзеньні сталінскага паходу асаблівую ўвагу зьвярнуў на адстаючыя цэхі камбінату — чурачны этыкеровачны.

За час сталінскага паходу на ўсіх цэхах камбінату арганізаваны тэхгурткі, да якіх прымацаваны члены ІТР.

За час паходу работы калектыў камбінату пры актыўным удзеле нізавога друку і рабкораў, пад кіраўніцтвам парт'ячэйкі, дабіўся значнага зруху ў выкананьні прамфінпляну. Калі да ўключэньня ў сталінскі паход прамфінплян за пяцідзёнку з 15-га па 20-е лютага быў выкананы на 99,1 проц., дык за апошнюю пяцідзёнку прамфінплян выкананы на 106,3 проц.

Але на гэтым нельга спыняцца. Рабкоры Бярэзінскага камбінату, пад кіраўніцтвам парткому, павінны яшчэ больш узмацніць барацьбу за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне часьці ўмоў тав. Сталіна, за права на рапарт 7-му ўсебеларускаму і 9 усесаюзнаму зьездам прафсаюзаў.

Брыгада «Зьвязды» і «Бальшавік» Барысаўшчыны».

ЛІПКІНД, СТРОНГІН, ШМІДТ.

ПА УДАРНАМУ РАЗГОРТВАЕЦЦА СТАЛІНСКІ ПАХОД У МАГІЛЕВЕ

Абвешчаны газэтай «Зьвязда», ЦСПСБ і «Рабселькорам» сталінскі паход-спаборніцтва нізавога друку стаў здабыткам шырокіх рабочых мас Магілеўскіх прадпрыемстваў. Апрача асобных прадпрыемстваў у конкурс ўключыліся і дэлегаты 2-га раённага зьезду прафсаюзаў.

6 сакавіка адбыўся масавы паход па праверцы рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна і разгортваньня сталінскага паходу-спаборніцтва нізавога друку на прадпрыемствах. Паходам кіраваў раённы зьезд прафсаюзаў. У паходзе ўдзельнічалі 40 дэлегатаў зьезду.

Рад шматтыражак і штодзённак ужо прыступілі да практычнай рэалізацыі ўмоў конкурсу. Як прыклад можна прывесьці вынікі ўдарнай работы рабочых і рабкораў заводу «Чырвоны адраджэнец» (мэталургічны). Шматтыражкай «Каваль сацыялізму» і заўкомам заводу шырока прапрацаваны сярод рабочых-ударнікаў умовы конкурсу. Нарада рабкораў намеціла аб'екты і плян правядзеньня ўнутры-заводзкага рэйду. Камсамольскі калектыў сумесна са шматтыражкай расставіў рабкораўскія пасты па ўсіх цэхах — арганізаваны 2 новыя штодзённі.

Штодзённка кавальскага цэху з першых дзён свайго існаваньня павяла барацьбу за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў цэху. Яна патрабуе ад майстра канкрэтнай, апэрацыйна-масавай і растлумачальнай работы па ўкараненьні ў цэху гаспадарчага разрахунку. Па яе ініцыятыве 3 кавалі Дарэўскі, Валозін і брыгадзір Бэдынэрман абвясьцілі сябе ўдарнікамі па рамонце с.-г. інвэнтару ў падшэфным Гаранскім сельсавеце ў свае выхадныя дні.

Асабліва ўдарныя і добрыя прыклады работы па конкурсе паказвае штодзённка зьмены Мар'ясіна швэйнай фабрыкі імя Валодарскага. Штодзённка на чале з рабкорам-старшынёю рэдкалегіі тав. Рахліным, правяла шырокую масавую растлумачальную работу сярод рабочых цэху.

Калі да першага сакавіка ў зьмене з 350 чал. кожны дзень ня выходзіла на работу па 30-50 чал., дык зараз нявыхадны зьнізіліся да 10-5 чал.

Да ўключэньня ў паход зьмена плялася ў хвосьце па выкананьні прамфінпляну — вытворчыя заданьні выконваліся на 95-96 проц. За апошні час у сувязі з ростам актыўнасьці рабочых, у сувязі з уключэньнем у сталінскі паход прамфінплян выконваецца на 130 проц., пры чым якасьць прадукцыі значна палепшылася.

На фабрыцы і ў прыватнасьці ў зьмене Мар'ясіна працуюць разам з бларусамі звыш 50 проц. яўрэяў. Рэдкалегія штодзённкі, усьвядоміўшы значэньне і неабходнасьць правільнага вырашэньня напытаньня, арганізавала і выпускае ў зьмене штодзённку на дзьвюх мовах, адну — на беларускай і другую — на яўрэйскай. Гэтыя дзьве штодзённкі за 8 дзён далі па 8 нумароў.

За ўдарную работу штодзённкі і рабкораў партканцтыў пастанавіў перадаць зьмене Мар'ясіна пераходны чырвоны сьцяг.

Ёсьць у Магілеве і адстаючыя прадпрыемствы. Да такіх адносяцца: рымарная фабрыка, чыгуначны вузел, хлебазавод, завод «Пралетары», «Зьвязда», «Зара», якія і да гэтага часу ігнаруюць уключэньне ў сталінскі паход.

Прахорчанка.

Камсамолец-ударнік Гомсельмашу тав. МЭРНІН — сыстэматычна перавыконвае прамфінплян.

У барацьбе за лепшую якасьць прадукцыі

Пасьля апублікаваньня ўмоў сталінскага паходу-спаборніцтва на працягу трох-чатырох дзён у яго ўключыліся амаль усе зьмены абутковай фабрыкі, яе асобныя цэхі, групы, брыгады і г. д. Прапрацоўваючы задачы і ўмовы сталінабавязацельствы, выходзячы са сваіх мясцовых умоў. Пытаньне сталінскага паходу прапрацоўвалася на ўсіх партсходах, і партгрупах. Партыйныя арганізацыі ўзначалілі ход работы па паходзе-спаборніцтве.

ФАБКОМ СУМЕСНА СА ШМАТТЫРАЖКАЙ АБВЯСЬЦІЎ унутры-фабрычны конкурс штодзённак, рабкораў, брыгадзіраў і цэхграфкамітэтаў на лепшае праведзеньне паходу і рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна.

У выніку разгорнутай работы па паходу, ужо маюцца некаторыя паказальніні. Арганізаваны 4 ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫЯ БРЫГАДЫ, ПАСТУПІЛА 45 РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ І 2 ВЫНАХОДЗКІЯ. 30 ЧАЛАВЕК НОВЫХ РАБОЧЫХ АХОПЛЕНЫ ПРАФЭСЬЯНАЛЬНЫМ ЧЛЕНСТВАМ.

Па выкананьні прамфінпляну за апошнюю дэкаду мы маем: замест 15-процантнага адхіленьня ад 1-га гатунку на пляну — 14,37 проц. Асобныя групы перавыконваюць прамфінпляны колькасна. Так, другая група швальнага цэху за люты мела выкананьне—101,7 проц., а за 9 дзён сакавіка — 110,7 проц. Трэцяя група машыннага цэху за апошнія 9 дзён дабілася адхіленьня ад 1-га гатунку да 13,68 проц. пры стопроцантным выкананьні колькасных паказальнікаў. Гэта хістаньне лічбы адхіленьня ад 1-га гатунку гаворыць аб тым, што мы яшчэ не змаглі пашырыць посьпехі, якія ёсьць па асобных групах і цэхах.

Сталінскі паход-спаборніцтва нізавога друку на фабрыцы павінен узмацніць яшчэ больш работу па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, па выкананьні прамфінпляну 1932 году.

Рэдактар шматтыражкі «Чырвоны абутнік» АСАЁНАК.

На буксір адстаючых

ВІЦЕБСК. Парт'ячэйка, прафарганізацыя, рабочыя, адміністрацыйна-тэхнічны персанал 9-й камсамольскай гаспадарча-разрахунковай брыгады-істужкі швэйнай ф-кі «Сьцяг індустрыялізацыі» ўключыліся ў сталінскі паход-спаборніцтва. Штодзённка ўжываецца ў працы зьменна-сустрэчнае плянаваньне. Баявую работу разгарнула і штодзённка гэтай брыгады. Рэдкалегія выпускае ў кожны перапынак 2-хгадзінныя зводкі аб ходзе выкананьня пляну, аб тормазах на асобных вучастках, паказваючы канкрэтных вінаватых. Такім чынам газэта мабілізуе масу рабочых на ліквідацыю прарываў, якія заўважаюцца ў тым, ці іншым месцы.

У выніку 9-я істужка перавыконвае сваё заданьне. 25-га лютага замест 61 адзінак, яна выпусьціла 521 адзінку, 28 лютага — 520 адзінак, а 29 — 55 адзінак. Ёсьць паляпшэньне якасьці.

Недахопам зьяўляецца тое, што слаба разгорнута культурна-масавая работа, а таксама работа вытворчых нарад.

Зусім на іншаму стаіць справа на 1-й маладзежнай істужцы, якая адстае і па колькасных і па якасных паказальніках прамфінпляну. Рабочыя істужкі не мабілізаваны на штурм прарыву. На істужцы слабая працдысцыпліна.

Улічваючы гэта, 9-я камсамольская істужка пастанавіла ўзяць на буксір 10-ю і дапамагчы ёй выйсьці з прарыву.

М. ШЛЕЙМОВІЧ.

РАЛЯПШАЕЦЦА РАБОТА ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД

Бюро парткому друкарні імя Сталіна (Менск) 4-га лютага абгаварыла пытаньне аб праведзеньні ў друкарні сталінскага паходу нізавога друку на лепшую работу па рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна. Разам з фабкомам друкарні шматтыражкай распрацован план крэпны плян праведзеньня сталінскага паходу. Пастанова бюро парткому патрабуе ад кожнай цэхпарт'ячэйкі ўзмацненьня кіраўніцтва ўсёй работай рабкораў і насьценгазэт па паходзе.

У друкарні ўжо разгортваецца практычная работа па праведзеньні сталінскага паходу. Шматтыражкай разам з фабкомам праводзіцца агляд-канкурс лепшых гаспадарча-разрахунковых брыгад. У конкурсе ўдзельнічаюць 5 лепшых гаспадарча-разрахункових брыгад, створан фонд для прэміраваньня.

Конкурс-агляд гаспадарча-разрахункових брыгад ужо зараз даў першы значныя вынікі. Падзітвацца брыгады, якія раней адставалі. Так, адставшыя раней гаспадарча-разрахункая брыгада кніжнай ратацыйнай машыны, праз спаборніцтва з іншымі брыгадамі заняла па выкананьні прамфінпляну адно з першых месц. Гэта брыгада праз сваю штодзённку ўсяла в букоір адстаючую гаспадарча-разрахункову брыгаду 1-й і 2-й друкарскіх машын. Перадавая брыгада ратацыйнай машыны практычна ажыцьцяўляе букоір над адстаючай брыгадай. На сумесным сходзе абедзьвюх брыгад перадавікі ратацыйнай брыгады перадалі брыгадзе першай і другой друкарскіх машын вопыт сваёй барацьбы з выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну.

Б. Ю.

ЗАЦЯЖКА ІЛЬНАЗАГАТОВАК—ТОРМАЗ У ПАДРЫХТОЎЦЫЎ ДА СЯБЫ

Максымальна фарсаваць тэмпы, у найкарацейшы тэрмін дабіцца 100 проц. выкананьня пляну!

Сакавік—рашаючы месяц

Першая палова сакавіка не дала пералому ў ходзе ільназагатовак па большасьці раёнаў БССР. За першую пяцідзёнку прырост у выкананьні пляну складаў усяго 0,2 проц., за другую пяцідзёнку — 0,3 проц.

Ня гледзячы на тое, што гадавы рэспубліканскі плян ільназагатовак выкананы усяго на 57 проц., некаторыя рэгіёны (Талочын, Гарадок) і сельсаветы схільны згарнуць кампанію, задаволіцца дасягнутым.

Такія настроі нельга назваць інакш, як нахровым апартунізмам, ня ўменьнем і нежаданьнем мабілізаваць масы на ажыцьцяўленьне заданьняў партыі і ўраду, на поўнае выкананьне ільназагатоўчых плянаў.

У радзе калгасаў лён у значнай колькасьці яшчэ не апрацаваны. Няўменьне арганізаваць працу, правільна скарыстоўваць рабочую сілу пры водзіць да таго, што ў некаторых калгасах ільнатраста не пераапрацоўваецца і псуецца. Характэрным прыкладам у гэтых адносінах зьяўляецца калгас **«Бурнаўка»,** Куратаўскага сельсавету, Талочынскага раёну, аб якім мы сёньня зьмяшчаем матар'ял. Аднаасобны сэктар — самы адсталы вучастак ільназагатовак. На 10 сакавіка плян па гэтым сэктары выкананы усяго на 39,4 проц.

Гэта — вынік яўнага паслабленьня масавай работы сярод аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў, слабай, а месцамі і поўнай адсутнасьці націску на кулацка-заможныя элементы. Цьвёрдыя заданьні па ільназагатоўках выконваюцца зусім нездавальняюча.

Адставаньне асабліва недапушчальна для групы ільнаводчых раёнаў, якія ў цэлым вырашаюць посьпех ільназагатовак па рэспубліцы. Да адстаючых ільнаводчых раёнаў адносіцца: Асьвейскі, Бешанковіцкі, Вушацкі, Гарадоцкі, Горацкі, Крупскі, Полацкі, Чашніцкі, Талочынскі і інш.

Набліжэньне веснавой сяўбы выклікае неабходнасьць мабілізаваць усе сілы, каб у найкарацейшы тэрмін завярыць ільназагатоўчую кампанію. «Заготлён» абвясьціў **сакавік** па радзе раёнаў Саюзу ў тым ліку і па **БССР ударным месячнікам ільчазагатовак.**

Усе раёны БССР павінны ўключыцца ў гэты месячнік, выкарыстаўшы вопыт Дрысеншчыны ў барацьбе за лён, за арганізацыю ўсебеларускага ільнянога чырвонага абозу.

50 работнікаў—у сельсаветы

КРУПКІ. (НАШ КАР.).

КРУПСКІ РАЁН ПРЫНЯЎ ВЫКЛІК ДРЫСЕНСКАГА РАЁНУ І ЎКЛОЧЫЎСЯ Ў АРГАНІЗАЦЫЮ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЧЫРВОНАГА АБОЗУ З ІЛЬНОМ. ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ДЭКАДНІКА ЗАВЯРШЭНЬНЯ ІЛЬНАЗАГАТОВАК, У СЕЛЬСАВЕТЫ НАКІРАВАНА 50 ЧАЛАВЕК РАЙАКТЫВУ.

ПЛІСКО.

Рэгістратары зводак

ТАЛОЧЫН (Ад нашага спэцкора).

Талочынскі раён усё яшчэ цягнецца ў хвасьце ільназагатовак. Плян на 10 сакавіка выкананы усяго на 47,5 проц. Прырост за пяцідзёнку складае 0,6 проц.

Раённыя ўпаўнаважаныя ў сельсаветах займаюцца толькі... зьбіраньнем статыстычных даных аб недахваце ільнавалакна, мэханічна рэгіструюць зводкі сельсаветаў і ніякай канкрэтнай работы не праводзяць.

Упаўнаважаны РВК Барала прабыў 2 тыдні ў сельсавеце. На запытаньне — як ідуць ільназагатоўкі, Барада адказаў: «Гэты вучастак выпаў з пад маёй увагі». Адказ—характэрны для апартуністаў, якія недаацэньваюць гаспадарча - палітычнай важнасьці ільназагатоўчай кампаніі.

У Высока-Гарадзкім, Еўлахаўскім, Славянскім, Рыдамальскім, Няхлюдаўскім, Палаўскім, сельсаветах ільназагатоўкі **спынены,** ня гледзячы на мізэрныя працанты выкананьня пляну. У той-жа час ільнавалакно разбазарваецца. 6 сакавіка ў мястэчку Талочына на рынку было шмат ільнавалакна. Выпадкі спекуляцыі ільнавалакном наглядаюцца **па Коханаўскім, Паўлаўскім і Сіманаўскім** сельсаветах.

У радзе калгасаў лён ляжыць неапрацаваным. Калгас «Бурнаўка», Куратаўскага сельсавету, мае 25 ёвень неапрацаватай трасты. Праўленне ня прымае ніякіх мер для арганізацыі хутчэйшай апрацоўкі. У выніку палова ільнатрасты ўжо папсавалася, а плян здачы дзяржаве ільнавалакна выканан ня больш чым на 50 проц. Такія факты безгаспадарчасьці маюць месца і ў паасобных калгасах Коханаўскага сельсавету.

Я. К.

Ветрынская МТС павінна ўзкачаліць барацьбу за лён

ПОЛАЦАК.

На 10-га сакавіка па Полацкім раёне плян ільназагатовак выкананы на 45,2 проц. За дэкаду паступіла толькі 15,7 цэнтн. валакна.

Асабліва недапушчальным трэба лічыць адставаньне калгасаў, якія абслугоўваюцца Ветрынскай МТС. Кіраўніцтва МТС не прыняло належных мер, каб дапамагчы калгасам фарсаваць пераапрацоўку.

У калгасах імя Фрунзэ, «Камінтэрн» «Чырвоны прымежнік», «Прагрэс» пераапрацоўка запазчаецца. У калгасе імя Фрунзэ ёсьць 70 тон непрапрацаванай трасты. Такое-ж становішча ў калгасах «Камінтэрн» і «Чырвоны прымежнік».

У мэтах узмацненьня тэмпаў загатовак па Полацкім раёне праводзіцца рэйд-праверка. У рэйд уключыліся і Ветрынская МТС. Вынная рэдакцыя «Чырвонай Полаччыны» разам з рэдкалегіяй насьценгазэты МТС **арганізавала з рабочых ударнікаў 13 брыгад друку** па правядзеньні рэйду праверкі выкананьня пляну ільназагатовак і падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі. Рэйдам-праверкай ахоплена 11 калгасаў: «Ленінскі прамень», «КІМ», «Ідэал», «Праца», «Новы сьвет», «Чырвоны сьлят», «Чырвоная Полаччына», «Свабода», «Перамога», імя Карла Маркса.

Ветрынская МТС павінна перавесьці сваю работу на сапраўды бальшавіцкія рэйкі. Ад дакладнай работы МТС залежыць у значнай ступені поўнае выкананьне пляну ільназагатовак і посьпяховае праведзеньне падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў калгасах раёну дзейнасьці МТС.

Ч. П.

Прэзыдэнцкія выбары ў Германіі

5 МІЛЬЁНАЎ ПРАЛЕТАРАЎ ДЭМАНСТРАВАЛІ

СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА БАРАЦЬБЫ ЗА РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ГЕРМАНІІ

„Ротэ Фанэ" аб папярэдніх выніках прэзыдэнцкіх выбараў

БЭРЛІН, 14. «Ротэ фанэ» зьмяшчае ў сваім трэцім экстраным выпуску перадавы артыкул аб папярэдніх выніках прэзыдэнцкіх выбараў, у якім піша:

«Заўтра мы дамо падрабязную прынцыповую ацэнку вынікаў выбараў, сёньня-ж абмяжуемся некалькімі заўвагамі. **5 мільёнаў рабочых і працоўных галасавалі ўчора ў Германіі за чырвонага кандыдата рабочых Э. Тэльмана.** Гэта зьявілася вялікай дэманстрацыяй, сьмелай заявай аб сваёй гатоўнасьці змагацца за рэвалюцыйнае вызваленьне Германіі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі наша партыя набыла 400 тысяч новых галасоў рабочых, працоўных сялян і дробнай буржуазіі. Асабліва знамянальны посьпехі нашай партыі ў аграрных раёнах, як **Усходняя Прусія, Верхняя Баварыя і Ніжняя Баварыя, што зьяўляецца адзнакай нашага ўзмоцненага ўплыву на вёсцы.**

Але ў парадку бальшавіцкай самакрытыкі мы адкрыта павінны канстатаваць, што нам, камуністам, яшчэ не ўдалося адцягнуць сацыял-дэмакратычных рабочых ад ліжывай, варожай рабочым, палітыкі «меншага зла» і заваяваць іх галасы за чырвонага кандыдата рабочай клясы — Тэльмана.

За час, які застаўся да другога туру выбараў, мы павінны будзем умацавацца на прадпрыемствах і павесьці больш рашучае наступленьне супроць «Жалезнага фронту». Рэзультаты выбараў у прамысловых раёнах, дзе посьпехам процістаіць у некаторых акругах захаваньне балейшага ліку галасоў, а часамі і паніжэньне, паказуе, нездавальняючыя вынікі ў Берліне —вось у чым заключаюцца найбольш істотныя ўрокі выбарчай барацьбы. (ТАСС).

Водгукі на выбары буржуазнага друку

ЛЁНДАН, 14. Рэзультаты прэзыдэнцкіх выбараў у Германіі вельмі мала камэнтуюцца друкам. «Н'юс Кронікль» падкрэсьлівае значную колькасьць выбаршчыкаў, якія пайшлі за гітлераўцамі і камуністамі і ўказвае на слабую перавагу «сіл здаровага розуму і парадку», падтрымаўшых Гіндэнбурга. Рэзультаты галасаваньня паказваюць, па думцы газэты, што жалі Германіі ня будзе ў бліжэйшым часе дана магчымасьць дыхаць, дык перадышка можа аказацца вельмі кароткай. У наступны раз можа не аказацца Гіндэнбурга, здольнага ўтрымаць пазыцыі.

Пахвалы францускай прэсы па адрасе сацыял-фашыстаў

ПАРЫЖ, 14. Наогул друк выказвае задавальненьне рэзультатамі прэзыдэнцкіх выбараў у Германіі, аднак, большасьць газэт адзначасова раіць не паддавацца празьмерным блюзіям на конт настроіў у Германіі, улічваючы, што «Экстрэмісты» атрымалі амаль столькі-ж галасоў, колькі атрымалі прыхільнікі «права і парадку». Газэты падкрэсьліваюць, што агнёсная перамога Гіндэнбурга дасягнута, па - першае, дзякуючы падтрыманьню сацыял - дэмакратаў, па - другое, таму, што Гіндэнбург у сваёй выбарчай праграме пераняў многае ў Гітлера і, нарэшце, дзякуючы асабістаму аўтарытэту Гіндэнбурга і «бадзейнасьці» пушчанага ў ход дзяржапарату.

«Журналь» выхваляе сацыял - дэмакратаў, якія паставілі інтарэсы Германіі вышэй за свае партыйныя інтарэсы».

«Попюлер» з гонарам адзначае рашучы акт перамогі сацыял - дэмакратаў.

АДКРЫЎСЯ VII УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ

Учора вечарам, у Доме Культуры, ва ўрачыстай абстаноўцы адкрыўся VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў. Залы і бальконы перапоўнены 2-тысячнай масай дэлегатаў і гасьцей.

Адкрываючы зьезд, старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў заяўляе:

—

Партыйнае будаўніцтва

АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧЫХ БРЫГАД І ДАТЭРМІНОВАЯ ССЫПКА НАСЕНЬНЯ

—БАЯВАЯ ЗАДАЧА ВЯСКОВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ

„Здольнасьць кіраўнікоў калгасаў і іх бальшавіцкага ядра будзе правяраца не на траскучых рэзалюцыях і шырокавяшчальных прывітаньнях, а на жывой справе правільнай арганізацыі сяўбы“ (Сталін)

Кіраваць канкрэтна, апэрацыйна

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 26 лютага аб мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў абавязаў усе партыйныя і калгасна-земельныя арганізацыі правесьці работу на арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад у калгасах да 1 красавіка. Разам з арганізацыяй брыгад толькі па вытворчым прынцыпе павінен быць пакладзен канец абязьлічцы і безадказнасьці. Брыгада вылучаецца цэнтральным зьвяном арганізацыі працы ў калгасах і чым хутчэй будзе праведзена гэта работа, тым лепш мы падрыхтуемся да веснавой пасеўнай кампаніі.

Прымацаваньне вытворчых вучасткаў, інвэнтару, цягавай сілы да брыгад, вылучэньне брыгадзіраў з лепшых калгасьнікаў — усё гэта практычныя пытаньні, акцыцыўленые якіх зьяўляецца простым абавязкам усіх зьвеньняў партыйных арганізацый. Гэта рэальнейшая работа патрабуе апэрацыйнага і канкрэтнага кіраўніцтва, асьлівa ў даны перыяд падрыхтоўкі да вясны. Найбольш слабым вучасткам вораг зьяўляецца збор насеньня. Таму барацьба за насеньне ў брыгадах павінна стаяць у цэнтры ўвагі, ад чаго будзе залежаць посьпех пасеўнай кампаніі.

Адзнак, матар'ялы з месц паказваюць, што ў некаторых раёнах няма на належнай барацьбы за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за арганізацыю брыгад. Замест практычнай работы антыгуністычныя элемэнты, якія знаходзяцца на поваце ў кулака, ня спыняюць разважаньняў аб тым, што дырэктыва ЦК ня можа быць ужыта ва ўмовах Беларусі і пастаянныя вытворчыя брыгады немагчыма арганізаваць.

Матар'ялы, якія сёньня прыходзяцца з Бярэзінскага раёну, паказваюць, што ня толькі асобныя сакратары ячэек, але і некаторыя кіруючыя работнікі раёнаў ніяк ня ўсвоілі значэньня дырэктыў ЦК. Упаўнаважаныя Бярэзінскага РК КП(б)Б па Сялібскім, Маціцкім і Бяганскім сельсаветах арганізавалі брыгады па зборы шопелу і на гэтай падставе лічаць дырэктывы ЦК выкананымі. За кіраўнікамі ячэек сьледуюць і некаторыя работнікі калгасаў. Так, старшыня калгасу імя Калініна зусім адкрыта заявіў: «Ніякіх брыгад мы арганізоўваць ня будзем».

Выступленьні апартуністычных элементаў супроць арганізацыі брыгад нельга інакш разглядаць, як простую дапамогу кулаку. Клясавы вораг вельмі добра разумее, што пастаянная брыгада наносіць рашучы ўдар па без гаспадарчасьці і безадказнасьці і ўмацоўвае калгас. На самой справе, што значыць выступаць супроць брыгад? Гэта значыць адмовіцца ад работы па наладжаньні калгаснай вытворчасьці, адмовіцца ад асноўнай задачы па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў і даць магчымасьць кулаку падрываць калгас з сярэдзіны.

Партарганізацыі павінны ведаць, што там, дзе апэрацыйна ня кіруюць арганізацыяй пастаянных брыгад, няма барацьбы за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, там зрываюць работу па павышэньні ўраджайнасьці і якасьці калгаснай вытворчасьці.

«ЦК КП(б)Б указвае ўсім партыйным арганізацыям, што задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасу зьяўляецца ў цяперашні час, перш за ўсё, задачай разьвіцьця і ўмацаваньня арцельнай формы калгасаў». Гэта значыць, што партарганізацыі павінны разгарнуць сапраўдную барацьбу за арганізацыю брыгад у калгасах і ўдарную падрыхтоўку да вясны. Усякая недаацэнка, апартуністычнае выступленьне супроць брыгад павінны атрымаць рашучы адпор.

Лёзненьская МТС рыхтуецца да сяўбы

ЛЁЗНА. У радыўсе абслугованьня МТС—82 калгасы. Вытворча-фінансавыя пляны склазены ў 66 калгасах, больш буйных. У астатніх складаньне плянаў заканчваецца. Дробныя калгасы ў гэтым годзе будуць мэханізаваны на 30-35 проц., вытворчасьць буйных калгасаў у асноўным пераводзіцца на мэханічнае абслугоўваньне.

15 сакавіка склікаецца савет МТС для зацьвярджэньня фінансава-вытворчых плянаў.

Рамонт трактараў амаль закончан. З 41 трактара, якія ёсьць у МТС, патрабавала капітальнага рамонту 35, адрамантаваны 33 па 11 сакавіка.

Бягучы рамонт 6 трактараў скончан. Гаручым забясьпечаны.

Горш праходзіць засыпка насенных фондаў. Збожжавых і бабовых культур патрэбна 11 337 цэнтнэраў, засыпаны—7.783 цэнтн. Гэтая колькасьць папаўняецца за кошт унутраных рэсурсаў калгасьнікаў. Справа ў тым, што яравыя не ва ўсіх калгасах былі абагулены. Насеньне ёсьць, яго зараз калгасы зьбіраюць.

Бульбай калгасы МТС будуць забясьпечаны. Ільнасемя патрэбна 5.429 цэнтн. ёсьць 2.582 цэнтн. Недахват ільнасемя тлумачыцца тым, што ў радзе калгасаў і асобных сельсаветаў (Стасеўскі, Выдрэйскі) ільнасемя было вывезена поўнасьцю, як негатуннковае. Зараз завозіцца гатуннковае.

Ачыстка засыпанага насеньня скончана. Зроблена праверка фактычнай засыпкі і ачысткі. Даныя аказаліся правільнымі. Вядзецца праверка ўсхожасьці насеньня на праверачным насенным пункце пры МТС.

Падрыхтавана кадраў: - мэханікаў разьязных—5 чал., 1 старшы мэханік 1 мэханік па сельска-гаспадарчых машынах. Падрыхтавана 25 старшых рулявых брыгадзіраў, з якіх 10 для Віцебскай МТС. Ёсьць сталы трактарысты, якія замацаваны за МТС, працавалі ў мінулым годзе—100 чал. і рыхтуецца 65 чал.

Калгасныя кадры масавай кваліфікацыі рыхтуюцца па лініі райкалгасаюзу. МТС мяркуе правесьці рад кароткa-тэрміновых курсаў (5-6 дзён) па перападрыхтоўцы машынаведаў.

Праводзіцца складаньне вытворчых брыгад.

З 15 да 25 сакавіка праводзяцца масавыя пробныя выезды ў поле, пра вяраецца гатоўнасьць да трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

А. Мікуцкі.

Змагацца з гастралёрствам

БЯРЭЗІНА. (Ад нашага спэцкора) Бярэзінская партарганізацыя ня здолела ў належнай меры мабілізаваць на выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Дырэктыва ЦК ад 4 лютага ня была пакладзена ў аснову работы кожнай партячэйкі.

Праўда, райкомам партыі былі ўхвалены адпаведныя пастановы, даны дырэктывы ячэйкам, але самая прыгожая пастанова застаецца пустым гукам, калі на яе выкананьне не мабілізуюцца масы, калі яна не праводзіцца ў жыцьцё.

Так адбывалася і ў Бярэзіне. Лютэ лічылі, што дзелі напісаць паперку, каб рэалізаваць гістарычную дырэктыву партыі, выпаўненьне якое забясьпечвае далейшы перамогі па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па разгортваньні калгаснага будаўніцтва.

У раёне панаваў настрой, што пастанова ЦК аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў адносіцца толькі да раёнаў, якія маюць калгасы з лікам у 400-500 гаспадарак, што нельга арганізоўваць брыгады і замацоўваць за імі пэўныя вучасткі работы ў калгасах Бярэзінскага раёну.

Такая апартуністычная «тэорыя» мае прыхільнікаў ня толькі сярод асобных сакратароў партячэек, старшынь сельсаветаў, але і сярод некаторых кіруючых работнікаў раёну.

Чым вытлумачыць тое, што ні адзін з шмат укаўнаважаных райкому літаральна нічога не зрабіў па выкананьні дырэктывы ЦК?

Усе без выключэньня партячэйкі ў райком даслалі весткі аб тым, што дырэктывы партыі па пытаньні арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў «прапрацаваны і выкананы канкрэтныя мерапрыемствы». На справе-ж пераважная большасьць ячэек ня толькі не намецілі «канкрэтных мерапрыемстваў», але не азнаёмілася з асноўнымі ўстаноўкамі партыі, не гаворачы ўжо аб азнаямленьні з імі шырокіх мас калгасьнікаў і адпаасобнікаў.

Старшыня сялібскага калгасу імя Калініна Ключ адкрыта заявіў: —Ніякіх брыгад мы арганізоўваць ня будзем.

На пытаньне, чаму ім, Ключом, ня выконваецца дырэктыва партыі, гэты семы Ключ надзвычайна адказаў: «Калі выконваць кожную дырэктыву, галавы на плячах не застанецца».

У гэтым-жа калгасе ідуе абурваючая белагаспадарчасьць, адсутнічае зьдзелычына, усё прапастаўлена самацёку, ураўнілаўка і абязьлічка. Жывёла ў калгасе пастаўлена пад удар з-за адсутнасьці кармоў, а на полі засталося 200 коп гнілога сена.

Сакратар Бягацкай парт'ячэйкі — п'яніца, анархіст, «очковтиратель» — сваёй бязьдзейнасьцю паставіў пад пагрозу зрыву веснавую сяўбу. Па сельсавеце толькі ў 4-х пунктах давезены пляны сяўбы да населішч, ачышчана толькі некалькі кілёграм насеньня. Зусім не адрамантаваны тар і ня ссыпана насеньне.

Лойка (сакратар ячэйкі) спакойна носіць у кішэні партбілет і спакойна праводзіць свае «работу», фактычна накіраваную на зрыў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Па бюро райкому 9 сакавіка, дзе заслухоўвалася яго справа аб падрыхтаванасьці сельсавету да веснавой сяўбы, Лойка з алімпійскім спакоем выгла заяўляў, што сельсавет цалкам гатовы да сяўбы, што ўсё ў парадку і вяна чаго непакоіцца. Лойка меў смеласьць заявіць, што непагодна пры яго ўзеле абмеркаваны і прыняты адпаасобнікамі пляны сяўбы ва ўсіх вёсках. Зусім ня цяжка было ўстанавіць, што Лойка літаральна ня быў ні ў адной вёсцы, літаральна нічога не зрабіў па растлумачэньні мясам адпаасобнікаў задач трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Падрыхтоўка да сяўбы ў калгасе імя Сталіна.

Але Лойка капчаткова забыльтаўся, калі стала пытаньне аб выкананьні дырэктывы партыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Бачыце, ён «жыў установуку камуністам» аб выкананьні дырэктывы, але яшчэ не пасьпеў праверыць. Праз некалькі хвілін высьвятлялася, што Лойка ня толькі не прапрацоўваў, ня чытаў, але і ў вочы ня бачыў пастановы ЦК ад 4 лютага.

Прыкладам, такой-жа адсталай работы заслугоўвае кіраўніцтва Мойцянскай партячэйкі на чале з сакратаром Сяманіка.

Сакратар Мойцянскай ячэйкі Яручка школьні не ўстурбаваўся, калі ў калгасе было захаравана больш 4 тон насеньня бульбы і пакрадзена яе менш гэтай колькасьці. Яручка гаворыць аб вялікай шкодзе насеньню, інвэнтару, хамутоў, прычым гаворыць так спакойна, нібы гэта ня ёсьць важнейшая справа падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, а нейкая драбніца, якая ня мае істотнага значэньня. Навошта хвалявацца — спакой перш за ўсё. Не адчуваецца балевой ударнай работы. Але, самае галоўнае — няма прыёркі выкананьня.

На раён пачкамі сьпяшчаюць людзі з райкому, РВК, прафсавету, райкалгасаюзу і г. д. Але што робяць гэтыя людзі ў калгасах, сельсаветах — ніхому нічога невядома. Праўда, відома, што работнікі прафсавету, мабілізаваньня на прыняцьцьне веснавой пасеўнай кампаніі, выхалі... і ў той-жа дзень вярнуліся ў мястэчка. Для іх у сельсаветах не знайшлося адпаведнай «работы». Сялібскі сельсавет за заводзіны два тыдні наведала ня менш 50 чалавек, мабілізаваных па розначэйных пытаньнях. Кожны з гэтай сярэй заняў у старшыні сельсавету і іншых нізавых работнікаў па 2-3 гадзіны на гутарку і на гэтым скончылася так званая работа «мабілізаваных».

Такое-ж становішча назіраецца і ў некаторых іншых сельсаветах. Людзі літаральна гастралююць, і зусім не займаюцца канкрэтнай работай.

Райком партыі ня зусім энэргічна змагаецца за апэрацыйнае, канкрэтнае кіраўніцтва. Яго работнікі яшчэ не паказваюць узораў апэрацыйнай работы. Толькі цяпер райком партыі прыступае да праверкі выкананьня, прычым слаба б'е на канкрэтных вось-ітах апартуністычнай практыкі. Махровы апартуніст Лойка заслугоўвае безагаворачнага выключэньня з раёну партыі, але яму чамусьці (у каторы раз!) выносяць выговар з апошніх папярэджаньняў.

Такая барацьба з правымі апартуністамі не забясьпечвае поўнай мабілізацыі ўсёй масы калгаснікаў на выкананьне галоўных задач па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі.

УЛ. МЯЖЗВІЧ.

Кулацкі агент атрымаў адпор

Партячэйка калгасу «Кастрычніцкая рэвалюцыя» (Менскі раён) шырока разгарнула работу па распрацоўцы пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. Прапрацоўка гэтых пастаноў праходзіць пад знакам разгорнутай падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай вясны.

Да апошняга часу ў калгасе панавала абязьлічка і ўраўнілаўка, што значна адбівалася на прадукцыйнасьці працы. Зараз гэтыя недахопы ў асноўным ліквідаваны. На ўсіх вучастках калгасу праводзяцца агульныя сходы і вытворчыя нарады. У часе абгаварэньня плянаў веснавой сяўбы на вучастках Шпількі і Журы 32 калгасьніка абвясьцілі сябе ўдарніка-мі і ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў.

Гэтых посьпехаў калгасьнікі дасягнулі, перамагаючы супраціўленьне клясава-варожых элемэнтаў. Пры абгаварэньні пытаньня аб сеўшчы насенных і фуражных фондаў, адзін з калгасьнікаў — былы заможнік Патэвіч Алесь — высунуў «прапанову» — здаваць у фуражны фонд салому толькі тады, калі за кожныя тры пуды гэтага корму праўленьне калгасу дасьць... 1 пуд. збожжа. Пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі калгасьнікі далі рашучы адпор гэтай вылазцы кулацкага агента, узмацненьнем работы па сеўшчы насенных фондаў.

Макарскі.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Скончылі збор насенфондаў

Скончылі збор насенфондаў.

Заслаўскі раён — калгас «Чырвоны прамень».

Чашніцкі раён — калгас «Чырвоны бор».

Церахаўскі раён — калгас «Чырвоны партызан».

„Чырвоны Ельск“ у радох перадавікоў

ЕЛЬСК. (Наш спэц. кар.).

Калгас «Чырвоны Ельск» па-ўдарнаму рыхтуецца да трэцяй бальшавіцкай вясны. Поўнасьцю засыпаны насеньнем і страхавымі фондамі, што цалкам забясьпечвае пасеўную плошчу яравога кліну.

Складзен кармовы бранізаны фонд у колькасьці 191,8 цэнт. канюшыны. Створаны вытворчыя брыгады: тры паляводчыя і адна пясьлярная. Навальская брыгада, якая была вылучана раней, канчае рамонт інвэнтару.

Масавы пробны выезд у поле

БЕШАНКОВІЧЫ. 8-га сакавіка амаль усе калгасы раёну правялі сваю гатоўнасьць да веснавой сяўбы масавым пробным выездам у поле. Пробны выезд паказаў, што пераважная частка калгасаў у асноўным гатова да сустрэчы вясны. У большасьці закончана ссыпка і вычыстка насенных фондаў.

Асаблівую баяздольнасьць у часе выезду паказалі калгасы «Красавік», Бешанковіцкага сельсавету, «Перамога», Пліскага сельсавету, «Перамога», Павіноўскага сельсавету і «Свабода», Бачэйкаўскага сельсавету, якія выехалі з добра адрамантаваным інвэнтаром, па добрых конях са спраўнай збруяй. На конях калгасаў «Красавік» і «Перамога» віселі нават новыя путы па шыях, а кожны калгасьнік гэтых калгасаў быў узброен малаткамі і французкімі ключамі.

Разам з гэтым ёсьць і такія калгасы (Пяцігорскага і Вульскага сельсаветаў), якія зусім не падрыхтаваліся да сяўбы і не прынялі ўдзелу ў пробным выезьдзе.

Эльпэр.

Падтрымліваем ініцыятыву калгасу „Чырвоны Дырыжабль“

ЕЛЬСК. Перадавыя калгасы Ельскага раёну актыўна адгукнуліся на ініцыятыву калгасу «Чырвоны дырыжабль» (Капыльскі раён) аб арганізацыі міжкалгаснай насеннай пазыкі.

Калгас «Чырвоная зара», Багучыцкага сельсавету, забясьпечыў сваю плошчу яравога кліну насеньнем, адсыпаў у фонд міжкалгаснай насеннай пазыкі 24 цэнт. аўса, 12 цэнт. ячменю і 22 цэнт. проса, 46 цэнт. грэчкі, 18 цэнт вікі і 200 цэнт. бульбы. Калгас «Рэвалюцыя» пасьля таго, як поўнасьцю забясьпечыў сваю плошчу насеньнем, адсыпаў 18 цэнт. аўса, 5 цэнт. ячменю, 5 цэнт. проса.

Панамароў.

Выкрываць манэўры клясавага ворага

Уваравіцкая партарганізацыя яшчэ не пераключылася на-сапраўднаму на падрыхтоўку да веснавой сяўбы. У радзе калгасаў раёну есьцька насенных і страхавых фондаў праходзіць вельмі марудна. Сярод адсталай часткі калгасьнікаў панаваны спазывецкія настроі. Такія настроі кулак імкнецца распальваць сярод мас для таго, каб сарваць падрыхтоўку да сяўбы.

У калгасе «Чырвоная плошча» ў часе абгаварэньня пляну веснавой сяўбы загадчык гаспадаркі Шумакоў заклікаў калгасьнікаў ня прымаць пасеўны пляц да таго часу, пакуль «дзяржава ня дасьць насеньня». Гэта выступленьне кулацкага агента ня атрымала належнага адпору.

На загаду старшыні калгасу «Кацінтэрн» Дзегцярова скормлена звыш 300 цэнтн. збожжа, прызначаных для веснавой сяўбы. Аналёгічныя злачынствы мелі месца ў калгасе «Чырвоны шлях». Задача партыйных ячэек, якія абслугоўваюць гэтыя калгасы, павысіць клясавую пільнасьць, разгарнуць узмоцненую работу па мабілізацыі калгасных і бяднякоў-серадняцкіх аднаасобных мас сялянства на бязьлітасную барацьбу з нелабітым яшчэ кулаком, шырока выкрываючы яго манэўры на сваячасовую падрыхтоўку да сяўбы.

М. Б.

Ігнаруюць асноўную задачу

У радзе калгасаў Тураўскага раёну яшчэ не распачата падрыхтоўка да веснавой сяўбы. У калгасе імя Х зьезду саветаў (Пераройскі сельсавет) нават не абмеркаван плян веснавой сяўбы ні на праўленьні, ні на агульным сходзе калгасьнікаў. Насенны і фуражны фонды ў калгасе ня складзены, інвэнтар не рамонтуецца. Старшыня калгасу тав. Казёл зусім ня цікавіцца калгаснай вытворчасьцю, а больш за ўсё зацікаўлен пабочнымі заработкамі. Па яго прыкладзе бязьдзейнічаюць і асобныя брыгадзіры. Так, брыгадзір Мінчук сам не працуе і дэзарганізуе работу ўсёй брыгады.

Ня лепш стаіць справа і з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ў калгасах «Левінскі шлях», «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоны будаўнік» і інш. гэтага-ж сельсавету. Усё гэта зьяўляецца вынікам таго, што Пераройская парт'ячэйка зусім слаба займаецца арганізацыяй калгаснай вытворчасьці, не мабілізавала калгасных мас на барацьбу з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі.

Найбольш адсталым вучасткам падрыхтоўкі да сяўбы па Тураўскім раёне зьяўляецца **арганізацыя працы.**

С. В.

Падрыхтоўка да сяўбы і задачы краявых газэт

З лісту культпропу ЦК УсеКП(б)

Гігантскія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва за тры гады пяцігодкі асабліва ярка праяўляюцца ў тым, што лепшае пытаньне «хто каго» канчаткова вырашана на карысьць сацыялізму і ў горадзе, і ў вёсцы. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі на базе высокай машыннай тэхнікі стала магчымай у рэзультаце пасьлядоўнага і пасьпяховага правядзеньня генэральнай лініі партыі па індустрыялізацыі СССР, на ўздым у першую чаргу цяжкай індустрыі і ў прыватнасьці сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва (будаўніцтва новых заводаў сельгасмашынабудаўніцтва, трактарнага, заводаў-камбайнаў). Савецкая дзяржава з году ў год укладае ўсё больш і больш матар'яльных сродкаў у справу далейшага разьвіцьця сельскай гаспадаркі, на аснове яе сацыялістычнай перабудовы. Капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку ў 1931 г. склалі 3.600 млн. руб., а ў 1932 г. савецкай дзяржавай уклад вацца 4.360 млн. Сельгасмашын у 1931 г. было дана вёсцы на суму 456 млн. руб., а ў 1932 г. — на 900 млн. руб. Колькасьць МТС па СССР да канца 1931 г. склала 1.400, а ў бягучым годзе сельская гаспадарка атрымае ад савецкай дзяржавы 1.700 новых МТС (71 тыс. трактараў) і агульнай магутнасьцю звыш 1 млн. конскіх сіл. Сельская гаспадарка ў 1932 г. атрымае 11 тыс штук аўтамашын. Веснавой бягучага году будзе завезена на палі 1.100 тыс. тон мінэральных угнаеньняў, супроць 953 тыс. тон за ўвесь мінулы год. Апрача таго, дзяржава штогод адпускае вялікія сумы на сельска-гаспадарчы крэдыт.

Гэтыя вялікарныя затраты на ўздым тэхнікі сельскай гаспадаркі павінны быць апраўданы бальшавіцкім правядзеньнем веснавой сяўбы і поўным выкананьнем пасеўнага пляну.

Вялікарныя вытворчыя заданьні па краявой сяўбе (102 млн. супроць 97,4 млн га веснавой сяўбы 1931 г.), пашырэньне плошчы тэхнічных культур для ўмацаваньня сырцовай базы лёгкай індустрыі і павялічэньня тавар-ных рэсурсаў краіны (пашырэньне пасеваў: бавоўны, ільну - даўгунцу, цукровых буракоў і інш.), укараненьне новых культур у радзе раёнаў, барацьба за высокі ўраджай, правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыемстваў на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, на аснове пастаноў ЦК ад 4-II—32 г. і 2-VIII—31 г. —усё гэта патрабуе выключна дакладнай падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Між тым, падрыхтоўчыя работы на месцах разгортваюцца нездавальняюча. На месцах паўтараюцца ў асноўным памылкі мінулага году, а іменна: зусім недапушчальна спазьняецца збор насенных і фуражных фондаў, падрыхтоўка цягавай сілы, рамонт трактараў і запасных частак, завоз гаручага і мінэральных угнаеньняў, арганізацыя працы ў калгасах і разьмеркаваньне калгаснага даходу ад ураджаю 1931 г. Асабліва нездавальняючае становішча стварылася са зборам насеньня.

Асноўная прычына недапушчальнага замаруджаньня з падрыхтоўкай да сяўбы і раней за ўсё са зборам насеньня — гэта апартуністычная стаўка на самацёк, утрымаўчыя настроі, разважаньне аб адсутнасьці збожжа, няўменьне арганізаваць збор насеньня. Гэтыя разважаньні і настроі па сутнасьці справы адлюстроўваюць кулацкае супраціўленьне пасьпяховаму падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Яўна нездавальняючы ход падрыхтоўкі да сяўбы па ўсіх вучастках (збор насеньня і фуражу, падрыхтоўка цягла, рамонт трактараў, арганізацыя працы, разьмеркаваньне даходаў праведзена на 20-II толькі ў палове калгасаў) тлумачыцца таксама надвычай слабым удзелам у падрыхтоўцы да сяўбы абласных і краявых газэт. Большасьць газэт, у тым ліку і раёнаў раньняй сяўбы, пачала падрыхтоўку да сяўбы толькі ў канцы студзеня пачатку лютага, г. зн. са спазьненьнем на паўтары - два месяцы. Прычым газэты, за рэдкім выключэньнем, ня здолелі скан цэнтраваць увагі на першачарговай задачы збору насенных і кармовых фондаў. Да такіх газэт трэба перш за ўсё аднесьці «Паволжскую правду», «Казакстанскую правду», у значнай меры «Молот» і пераважную большасьць газэт раёнаў сяўбы другой чаргі (у тым ліку і недародных). Газэты Сярэдняй Азіі і Закаўказьля («Правда Востока», «Узбекистанская правда», «Кзыл Узбекистан», «Заря Востока») дрэнна змагаюцца за будаўніцтва ірыгацыйнай сеткі і за арганізацыю працы ў калгасах і саўгасах.

Кіруючы краявы друк у большасьці сваёй ня здолеў надаць падрыхтоўцы да сяўбы завостраны палітычны характар. У лепшым выпадку газэты толькі рэгіструюць факты абвостранай клясавай барацьбы вакол падрыхтоўкі да сяўбы і, як правіла, газэтныя падборкі аб сяўбе і ў прыватнасьці аб пасеньні атрымліваюць толькі інфармацыйна - тэхнічнае, а не палітычнае афарбленьне. Газэты часта выпустошваюць палітычнае значэньне і сутнасьць падрыхтоўкі да сяўбы.

Такое становішча ў далейшым непрыпіма ні адзнака яна. Выходзячы з першачарговасьці задачы мабілізацыі насеньня, газэты павінны разгарнуць арганізацыйную і шырокую масавую работу вакол мабілізацыі калгаснага насеньня, на аснове пастановы СНК і ЦК УсеКП(б) ад 17/II. Для гэтага неабходна падхапіць і шырока распаўсюдзіць пачын перадавых калгасьнікаў, якія ўжываюць новыя апраўдушыя сябе мерапрыемствы збору насеньня; міжраённая і міжкалгасная дапамога насеньнем адных раёнаў і калгасаў другім (у прыватнасьці мэтады грамадзкага буксіру) і на аснове гэтай сацыялістычнай узаемадапамогі плянавае пераразьмеркаваньне насеньня: унутрыкалгасныя пазыкі насеньня ў калгасьнікаў (трэба шырока прапагандаваць вопыт перадавых калгасаў Міхайлаўскага раёну Н.-Волгі, па ініцыятыве якіх у раёне выпушчаны аблігацыі насеннай пазыкі, цэнпасьцю ў 10, 15, 50 і 100 клгр.), масавая з удзелам калгаснага актыву самаправерка калгасных фондаў (у тым ліку і пераважаньне збожжа), а таксама масавая праверка перадавымі калгасамі і збор насеньня, стан насенфондаў у адстаючых калгасах, праверка, якая суправаджаецца дапамогай ім у засыпцы нехапаючага насеньня. Зразумела, трэба ня толькі прапагандаваць гэтыя мерапрыемствы, але і прымаць практычны ўдзел у іх ажыцьцяўленьні: арганізаваць насенныя рабселькораўскія рэйды, уключыцца ў буксір кантрольных вядучых раёнаў над адсталымі, арганізуючы выязныя рэдакцыі, выпуск лістовак, актывізуючы ў гэтым напрамку раённы і калгасны - саўгасны друк. Усю работу па зборы насенфондаў праводзіць на аснове шырокага сацыялістычнага спаборніцтва ўнутры калгасаў паміж калгасамі, раёнамі, а таксама паміж краямі (вобласьцямі). Рэкамэндуецца арганізаваць у асобных раёнах і ў краі ў цэлым рабселькораўскія паходы праверкі і арганізацыі масавай засыпкі насеньня.

Газэты павінны арганізаваць усебаковы паказ таго, як той ці іншы перадавы калгас або раён здолелі па-бальшавіцку арганізаваць у тэрмін і поўнасьцю скончыць збор насеньня. Усяляк заахвочваючы лепшыя раёны, калгасы, асобныя брыгады, хутка распаўсюджваючы іх вопыт, газэты разам з тым павінны бязьлітасна змагацца з «ляўацкімі» скажэньнямі дырэктыў партыі аб зборы насеньня. Неабходна забясьпечыць поўную захаванасьць ужо сабранага насеньня і разгарнуць барацьбу за арганізацыю своячасовай ачысткі і сартаваньня насеньня. Ні ў якім выпадку нельга забываць вялікага значэньня падрыхтоўкі насеньня і правядзеньня другіх перадасеўных мерапрыемстваў сярод аднаасобнікаў: камісія садзейнасьці, самазабазапельствы па зборы насеньня і па сяўбе культур, агульныя сходы аднаасобнікаў з папярэднім сходам беднакоў аднаасобнікаў.

Газэты павінны бязьлітасна выкрываць апартуністычную стаўку на самацёк, выкрываць кулацкую сутнасьць разважаньняў аб адсутнасьці насеньня, бічаваць утрымаўчыя настроі, выкрываць канкрэтных віноватых разбазаваньня ўжо сабраных насенфондаў, біць па спэкулянтах, утойвацелях калгаснага збожжа. Адначасова са зборам насеньня, газэты павінны разгарнуць барацьбу за збор фуражных фондаў і падрыхтоўку жывога цягла. Недаацэнка збору кармоў павінна кляймідзіць у газэтах, як апартуністычная недаацэнка жывой цягавай сілы (калгаснага каня, вала, а ў радзе месц прыдзецца ўжыць як цягавую сілу на лёгкіх работах карову).

Наступны вучастак падрыхтоўкі сяўбы — гэта рамонт трактараў і падрыхтоўка с.-г. машын і запасных частак. Рамонт трактараў зрываецца ў рэзультаце дрэннай арганізацыі працы ў майстэрнях саўгасаў, МТС, а таксама на заводах. Дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня на заводах і ў майстэрнях 6 умоў тав. Сталіна, арганізаваць шырокі абмен вопытам на аснове сапаборніцтва і вытворчай пераклічкі — такавы задачы газэт у барацьбе за выкананьне пляну рамонту трактараў і с.-г. машын. Трэба наладзіць дакладны ўлік усяго с.-г. інвэнтару і прыладаў, распрацаваць каляндарныя тэрміны рамонту і давесьці іх у найкарацейшы тэрмін да машынна - трактарнай майстэрні, да рамонтнага рабочага.

Газэты раёнаў сельгасмашынабудаўніцтва павінны разгарнуць барацьбу за своячасовае выкананьне заводамі вытворчых праграм па выпуску с.-г. машын і запасных частак, асабліва запчастак да трактараў. Таксама неабходна паклапаціцца аб хуткім прасоўваньні, асабліва ў раёны раньняй сяўбы, па чыгунцы як сельгасмашыны, так і мінэральных угнаеньняў. Трэба сумесна з транспартнымі газэтамі стварыць брыгады сацзейнасьці перавозцы пасеўных грузаў, арганізаваць «сквозны» кантроль па прасоўваньні іх да складу заводу, да атрымацеля.

Газэты павінны злучаць барацьбу за насеньне, за тэхнічнае ўзбраеньне сяўбы з барацьбой за правільную арганізацыю калгаснай працы, выходзячы з указаньняў ЦК ад 4 лютага аб тым, што «важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць брыгада». У першую чаргу трэба забясьпечыць правільную пабудову брыгад і дакладны падбор брыгадзіраў з аспрэдзішча лепшых калгасьнікаў. Трэба дабіцца павышэньня вытворчай кваліфікацыі і палітычнага ўзроўню кожнага брыгадзіра. Усямерна выкарыстоўваючы нізавыя раённыя і калгасна - саўгасныя, а таксама брыгадна - палявыя газэты і выязныя штурмоўкі, трэба разгарнуць сапаборніцтва і пераклічку брыгад як унутры калгасаў, так і паміж калгасамі.

Краявыя газэты павінны па сваіх старонках шырока арганізаваць абмен лепшым вопытам арганізацыі працы ў калгасах, завочныя вытворчыя нарады, рапарты лепшых брыгад, зьлёты лепшых брыгадзіраў, шырокі паказ герояў працы. Трэба ў коранным пераламаць уоякія скажэньні дырэктыў партыі аб арганізацыі працы і бязьлітасна выкрываць спробы кулацтва і яго правапартуністычнай агентуры — падарваць калгас з сярэдзіны, шляхам скажэньня прынцыпаў улікі і аплаты працы. Неабходна дабіцца неадкладнай і правільнай расстаноўкі сіл ў кожным калгасе, разьмеркаваньня паміж брыгадамі вучасткаў зямлі, машын, рабочай жывёлы з тым, каб ужо зараз стымуляваць збор насеньня і фуражу, рамонт інвэнтару і г. д., дабіваючыся ўзмацненьня кіраўніцтва калгасамі з боку райкалгасаюзаў.

Барацьба за ўраджай павінна ісьці раней за ўсё па лініі забясьпячэньня раньніх тэрмінаў сяўбы, поўнага сартаваньня і ачысткі насеньня, гатунковага абмену, правільнага севазвароту, дакладнай апрацоўкі глебы і ўгнаеньня і г. д. Трэба шырока растлумачыць у лёзунгах, артыкулах, што галоўнейшая прадпасылка павышэньня ўраджайнасьці — гэта раньняя сяўба.

Газэты павінны шырока прапагандаваць указаньне УсеЦВК ад 10-II аб тым, што «ўсю работу выкананчых органаў і савецтваў па правядзеньні веснавой сяўбы ён будзе ацэньваць у залежнасьці ад лепшай падрыхтоўкі, своячасовага правядзеньня і якасных рэзультатаў пасеўнай кампаніі». Вялікарная адказнасьць за пасьпяховую арганізацыю сяўбы ўскладаецца на краявыя і раённыя калгасаюзы. Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага аб арганізацыі калгаснай працы, на аснове брыгады абавязвае калгасаюзы і МТС па-бальшавіцку перабудаваць мэтады сваёй работы і па падрыхтоўцы калгасных кадраў і на кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам у цэлым. Газэты павінны фарсаваць гэту перабудову і разам з тым дабіваецца выраснага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку калгасаюзаў падрыхтоўкай сяўбы на ўсіх адкатных вучастках і перш за ўсё на вучастку збору калгасных насенфондаў.

Нарэшце, друк павінен ужо зараз шчыльна заняцца такімі пытаньнямі, як: своячасовае складаньне ўнутрыкалгасных вытворчых плянаў, з абгаварэньнем іх на сходах калгасьнікаў, давядзеньне іх да брыгады, падрыхтоўка кадраў, выхаваўчая работа з калгасным актывам хутчэйшае скажэньне разьмеркаваньня калгасных даходаў ад ураджаю 1931 г. Газэты павінны разгарнуць масавую работу вакол падрыхтоўкі да сяўбы з улікам спэцыфікі с.-г. эканомікі сваёй рэспублікі, краю (вобласьці). Адзнак, перад усімі газэтамі ставіцца агульная баявая задача — арганізаваць сяўбу, забясьпечыць павышаны ўраджай, умацаваць калгасы.

Культпроп ЦК УсеКП(б)

НА МОГІЛКАХ ХАЙ-ГЕЙТ

Німала зьмен адбылося ў знадворным абліччы Лёндану за апошнія 50-60 год.

Зьнікі, на выпрымаўшы канкурэнцыі аўтобусаў і таксі, запрожаныя коньмі наёмныя кароты і амнібусы— Адзіны лёнданскі ізвозчык 77-гадовы Вікстар Найт у апошні раз нядаўна ўпрог свайго негага коніка і праехаў на запружанай аўтамабілямі Оксфордстрыт. Жалобнае абнавіна пахавальнай калясьніцы прадстаўляў непавадотлівы фаэтон са зьнікаючым пад дажджай ліверэяй і цыліндрам фурманом на козлах. Іншы на пенсію, містэр Найт сказаў перад рэпарцёрамі кароткае разьвітальнае слова аб днёх сваёй маладосьці:

— Паверце мне, жыцьцё тады было больш шчасьлівым і вольным для рамізьнікаў, чым цяпер яно зрабілася для шофэраў. Мы былі прыяцелямі і ня ведаючы сьпешкі, маглі пераляцець словам з козлаў, сустракаючыся на вуліцах. Коні ніколі не падводзілі нас і катастрофы здараліся рэдка. Помню, якой радзеяй для Лёндану быў зьяўленьне гумавых шынаў, якія замянілі грукаючыя жалезныя. Седзелі седалі коняй, умелі танцаваць добрую ігру і нават часамі прапанавалі мне цыгары... Званочкі на шыях коняй брахтэлі, пазіраючы прахожых. У цэкры лікітары на каротах асьвятлялі вуліцы мігаючы і зьнікаючы як сьветлячкі.

Аднак, непараўнальна менш, чым цэнтральныя лёнданскія вуліцы, зьмяняўся Хэм-стэд, што знаходзіцца на паўночна-заходніх халмох, і прыляжачы да яго зялёны вясковы Хай-Гейт. Вулічны рух тут незначны і вечары, як і ў мінулым стагодзьдзі дрыжаць, кідаючы на чорны асфальт бальмо сьвятла, «газавыя ражкі».

Сярод нізкіх дамоў Хай-Гейта шмат часьнікаў — старажытных амнібусаў, карычневых сурдутаў, клечатых капелюшоў, кучэравых борад і бакенбардаў.

Мінулае паўстаўзьдзе абыйшло міма абведзеныя жалезнай агарожай могілкі Хай-Гейт.

Удасканальваюцца крэматоры і спосабы дастаўкі нябошчыкаў у магілы і распаленыя печы, але нязьменна шыкоўныя і салідныя старыя могілкі.

Зьнік разам з амнібусам павольны з афалк, які цягнулі ўпрыжоканыя коні, перадаўшы свае функцыі электрычаму і бясшумнаму, як лякавы пан гофэль, пашыўжанай формы аўтамабілю. Застаюцца традыцыйна-далікатныя магільшчыкі, якія нязбайна кажаюць ямы ды балбатлівы вартаўнік могілак, які ахоўвае іржавыя вашкі з выцьвілымі стужкамі.

Ангельскія магілы памёршых прадстаўнікоў мідл - клясы пазбаўлены асобных адзнак, як і ямы жывых. Плоскія надгробныя пліты ў адпаліраваным парашку фальсамлюць імя, узрост, дату сьмерці і апошні пры жыцьці гаранкі цэрас нябошчыка. Іншы раз з мармуровага барэльефу, надзвычайнага памінальнага камня глядзіць уніз белая морда валікага бульдога. Залаты надпіс, выведены вакол сабачай фігуры кароткі: «Яе ўлюбёны сабака».

Могілкі Хай-Гейт надзвычайна перапоўнены. Магільныя кучыны адзнак агаварылі права наступных пакаленьняў на скарыстаньне свабодным клочкам. Дамаяны членам адной і тэйжа сям'і нарэшта ставяць адзін паверх другога, пакуль апошні ня будзе ўпіраца ў каменную засклону--помнік.

Сярод адпастайных магілак, якія цесна стаяць адна ля другой, цяжка адшукаць апошні прытулак Карла Маркса. Ён зьнікае на могілках сярод бязьлікіх, асуджаных на забыцьцё, магіл дробных буржуа, крамнікаў, клеркаў, журналісцкай галечы, ваенных і цывільных пэнсіянэраў.

Магіла Маркса — адна з самых скромных і непрыметных на могілках Хай-Гейта.

Без агарожы, бяз помніка, прыпушчаная простай каменнай плітой, яна робіць бязьмерна сумнае прыгнечваючае ўражаньне.

Найвялікшы геній, які жыў у надзвычайных пакутах, пахаваны як невядомы літаратар. Пад каменем, на якім суха пералічаны імёны пахаваных, знаходзяцца чатыры дамавіны: Маркса, яго жонкі Джэні, іх маленькага ўнука—Лёнге, які памёр у адзін год з дзедам, і прыяцеля Марксавай сям'і — работніцы Гелены Дэмут.

Ні адзін палкі радок «Камуністычнага манифэсту», ні адно прароцкае прадказаньне «Капіталу» не заклікае да сьвету з магільнай плёты салікага пралетарскага рэвалюцыянэра. Мёртвы Маркс не парушае спакою могілак Хай-Гейт.

***

Вясна 1883 году была асабліва ветраная і сьцюдзёная. Лікі, сьнег сьляпіў вочы коням і ад сталічнага цэнтру да акраіны Хай-Гейт прыходзілася ехаць добрых 2-3 гадзіны.

14 сакавіка ў лёнданскі нясны дзень пазаўсёды заснуў у сваім крэсьле без агоніі, бяз мук Карл Маркс. Тут, на вострае ён правёў у выгнаньні многія гады свайго жыцьця. Тут за сталом бібліятэкі брытанскага музэю прадаваў Маркс над рукапісамі «Капіталу».

Лёндан, які прытуліў Маркса, быў сьведкай яго веапісальных матар'яльных пакут.

З перапіскі Маркса з прыяцелям-пашлечнікам Энгельсам прарываюцца бязвыходныя стогны, кантонная трагедыя сумнага штодзённага ярма, пастаяннага безграшоўя.

«Настаўшыя тут халады,—піша ён у студзені 1858 году,—і поўная адсутнасьць вугалю ў нашай кватэры прымушаюць мяне зноў зьвяртацца да цябе, хоць для мяне гэта цяжэй за ўсё на сьвеце... Сапраўды, калі такое становішча будзе і далей, я палічыў-бы за лепшае ляжаць у ста сажнях пад зямлёй чым мучацца такім чынам. Быць пастаянна ў цяжар другім і ў той-жа час саюзу заўсёды стамляцца ў барацьбе з самымі агіднымі дробязямі жыцьця — надоўга гэта нязносна. Я яшчэ лёгка магу ва ўпартай рабоце над агульнымі пытаньнямі забыць пра гэтыя пакуты, але ў мэёй жонкі, праўмела, няма гэтага прытулку...»

Ня раз Маркс пералічвае Энгельсу свае неадкладныя даўгі. У іх намінуча фігуруюць: газэтчык, мясьнік, прадавец гародніны, доктар, узнос у ламбард, шавец і вугляр.

У тым-жа нясчасным 1858 годзе Маркс пасылае Энгельсу сумны, як яго магіла, абураючы ліст, у якім ёсьць такія радкі:

«...Жонка мая заяўляе мне кожны дзень, што лепш-бы ёй з дзецьмі ляжаць у магіле і я сапраўды не магу на яе за гэта злаваца, бо прыніжэньні, мукі і жахі, якія нам прыходзіцца пераносіць у гэтым становішчы, не падлягаюць апісаньню — усе 50 фунтаў пашлі, як табе вядома, на ўплату даўгоў, з якіх усё-ж удалося ўплаціць менш паловы. Два фунты пашлю на газ... Я не гавару ўжо аб тэй, для Лёндану наогул небясьпечнай сытуацыі, калі прыходзіцца сем тыдняў існаваць бяз адзінага граша ў кішэні, — гэта ў нас зараз хранічнае зьявішча. Але-ж ты на ўласным вопыце ведаеш, што ёсьць заўсёды бягучыя выдаткі, па якіх прыходзіцца плаціць наўтыкі. Мы іх пакрылі тым, што сноў заклалі рэчы, узятыя з ламбарду ў канцы красавіка. Але гэтая крыніца за апошнія тыдні настолькі вычарпалася, што мая жонка зрабіла нават на мінулым тыдні дарэмную спробу прадаць некаторыя з маіх кніг. Бедных дзяцей мне зараз асабліва шкада. Як гэта ня дзіўна, мой чэрап працуе пры ўсёй гэтай галечы так добра, як не працаваў ужо шмат год».

Падобныя лісты пачынаюцца на працягу шмат год жыцьця нястомнага смагара і найвялікшага рэвалюцыйнага мысьляцеля, які перанёс усю горкасьць голаду і нішчасьцяў, паклёпу і прасьледаваньняў наймовых пісак і ўратаў буржуазіі. Энгельс заўсёды прыходзіць на дапамогу прыяцелю, ратуючы яго ад фізычнай пагібелі пад ярмом галечы і ўсё-ж ваўчаснай сьмерці Маркса была сумным вынікам перанесеных ім пакут.

***

Могілкі Хай-Гейт знаходзяцца на схіле ўгорку. Уніз, здалёку—Лёндан — горад банкаў, асабнякоў, гандлёвых кантор, калёніяльных штабаў, раскошных магазынаў, папуных палацоў, чорных хібарак. Бліскі яшчэ пануюць над хібаркамі, як і сорак дзесяць год назад, калі ў Лёндане стала больш на адну скромную магілу. Але блізкі іншыя часы; Лёндан, роўнадушна забыўшы цяпер магілу на Хай-Гейт, зьбіраецца да яе з любоўю, гордасьцю і разуменьнем.

У чаканьні гэтай гадкіны сьвежыя чырвоныя кветкі — адзінае ўпрыгожаньне — рассыпаны на нарматнай шліце Карла Маркса.

Гарт Сьвіб.

«Праўда».

Рыхтаваўца да торфсэзону

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КВАТЭРАМІ РАБОЧЫХ-ТОРФЯНІКАЎ

Па-ўдарнаму разгарнуць жыльлёвае будаўніцтва на торфзаводах

Адной з асноўных задач падрыхтоўкі да торфсэзону 1932 г. зьяўляецца забесьпячэньне рабочых кватэрамі. Аднак, гэтаму вучастку работы не аддаецца належнай увагі.

Як стаіць справа з жыльлёвай плошчай на буйных заводах Белторфу? Вельмі дрэнна. Так, на торфазводзе «Закрашынскі мох» рабочыя забясьпечаны жыллёвай плошчай на 84 проц., на заводзе «Чырвоная Беларусь» — на 72 проц., «Свабода»—на 71 проц., «Асінторф»—на 68 проц., заводзе імя Даўмана—на 56 проц., «Бальшавік» —на 51 проц., «Чырвоны сьцяг»—на 47 проц., заводзе імя 1-га мая— на 45 проц., «Смалявічы»—на 23 проц. толькі торфазводы «Шлях сацыялізму» і «Татарка» поўнасьцю забясьпечаны жыллёвай плошчай.

Белторф дагэтуль ня прыняў належных захадаў да разгортваньня жыльлёвага будаўніцтва на торфазводах. Той факт, што праграма будаўніцтва на 1932 год складзена толькі ў канцы лютага, зьяўляецца выразным прыкладам таго, наколькі кіраўніцтва Белторфу недаацэньвае ўсёй важнасьці своечасовай падрыхтоўкі да торфсэзону.

Паводле пляну, асноўнае будаўніцтва павінна было распачацца ў першым квартале і скончыцца не пазьней 1 мая.

Што робяць торфазводы, дзе распачата будаўніцтвам і колькі ўжо пабудавана—кіраўніцтва Белторфу на сёньняшні дзень ня ведае.

ВСНГБ і Дзяржплян таксама мала аддаюць увагі гэтаму вучастку работы. Узяць хоць-бы такое важнае пытаньне, як забесьпячэньне будаўніцтва матар'ялямі. Што зроблена ВСНГБ і Дзяржпляном у гэтай галіне? Вельмі мала. Замест 7.000 кбм. піловачніка, які павінен быў быць адпушчан Белторфу ў першым квартале, выдана на радаў толькі на 1,5 тыс. кбм. Такое-ж прыблізна становішча і з выдачай народаў на круглы лес, гонту і цыкі.

Большасьць заводаў («Бальшавік», імя Гея і іншыя), паводле даных з раёнаў на сёньняшні дзень яшчэ не распачалі жыльлёвага будаўніцтва. Будаўнічыя матар'ялы, якія атрыманы ў невыстарчальнай колькасьці, вывозяцца зусім марудна (піловачніка вывезена 25 проц., гонты—15 проц.).

Такое становішча з разгортваньнем будаўніцтва стварае пагрозу забесьпячэньню торфазводаў неабходнай жыльлёвай плошчай для разьмяшчэньня рабочых.

Белторфу, ВСНГБ, Дзяржпляну і ўсім партыйна-прафэсыянальным арганізацыям торфазводаў на месцах неабходна зараз-жа па-баявому ўзяцца за разгортваньне жыльлёвага будаўніцтва, мабілізаваўшы вакол гэтага пытаньня шырокія масы рабочых і калгаснікаў.

Ня рыхтуюцца да торфсэзону

Торфазводы **«Чырвоны Кастрычнік»** і **«Камунар»** у 1932 годзе для прамысловасьці г. Барысава павінны здабыць 49.000 тон торфу. Для таго, каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне гэтага пляну, ад арганізацый вышэйпаказаных заводаў патрабуецца максымальная ўвага падрыхтоўцы да торфсэзону.

Аднак, у гэтым напрамку амаль што нічога ня робіцца. Інтэрнаты і бараки для сэзонных рабочых знаходзяцца ў вельмі дрэнным стане, рамонт іх яшчэ не распачаўся. Пачатае ў мінулым годзе жыльлёвае будаўніцтва на заводзе «Камунар» дагэтуль яшчэ ня скончана.

Брыгада «Зьвязды»:
МІШКІН, САЛАВЕЙЧЫК, НЭЙДЛІН.

Да будаўніцтва не прыступілі

Паводле папярэдніх абяцаньняў торфазавод **«Міханавічы»** ў 1932 годзе павінен пабудаваць два новых будынкі (барак і лазьню) і адрамантаваць адзін стары дом. На сёньняшні дзень кіраўніцтва заводу ня толькі не прыступіла да будаўніцтва новых аб'ектаў, але не распачало рамонту старых памяшканьняў.

Загатоўленыя 500 кбм. другога лесаматар'ялу з-за нядбайнасьці і безгаспадарчасьці загатоўшчыкаў ака заліся годнымі толькі на 10 проц. Увесь гэты матар'ял пакінут без нагляду і напалову раскрадзен.

Герман.

Сацспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку

Адбылася 1 канфэрэнцыя старшынь торфараспрацоўчых арцеляй Рагачоўскага і Жлобінскага райпрамсаюзаў сумесна з ударнікамі рабочымі—тарфянікамі. Канфэрэнцыя падвяла вынікі торфараспрацовак і вывазкі сэзону 1931 году і абгаварыла плян 1932 г. Адзначыўшы, што ў выкананьні пляну торфаздабычы 1931 году райпрамсаюзы маюць вялікія дасягненьні (замест 8 тыс. тон, здабыта 12 тыс. тон), а таксама поўнасьцю выканан плян вывазкі торфу ў колькасьці 7.000 тон для БелДРЭС, канфэрэнцыя ўказала на невыстарчальную падрыхтоўку райпрамсаюзаў да сэзону 1932 г. Канфэрэнцыя прыняла вызначаную Белкампрамторфсаюзам вытворчую праграму на 1932 год у колькасьці 48 тыс. тон торфу, якая ў параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне ў 4 разы. Адначасова канфэрэнцыя выступила сустрэчным пляном у колькасьці 1.600 тон. За ўдарную работу на торфараспрацоўках і вывазцы торфу канфэрэнцыя прэміявала 48 рабочых ударнікаў і 9 старшынь праўленьняў арцеляй.

Для пасьпяховай падрыхтоўкі да новага торфасэзону і выкананьня вытворчага пляну 1932 г. старшыні праўленьняў торфараспрацоўчых арцеляй Рагачоўшчыны заключылі дагаворы на сацспаборніцтва з арцелямі Жлобінскага раёну.

К.

Сустрэчны ў 7 тысяч тон

Нарада старшынь праўленьняў торфараспрацоўчых арцеляй **Баброўскага** райпрамсаюзу, разглядзеўшы плян торфаздабычы на 1932 г. у колькасьці 33 тыс. тон торфу, складзены Белпрамторфсаюзам, знайшла магчымым гэтую лічбу павялічыць да 40 тыс. тон.

Удзельнікі нарады абвясьцілі сябе ўдарнікамі тарфянога фронту і выклікалі на сацспаборніцтва Рагачоўскі райпрамсаюз.

Л.

МНОЖЫЦЬ ДАСЯГНЕНЬНІ ДЭКАДНІКА

праверкі ліквідацыі няпісьменнасьці

Больш упарта змагацца за пісьменнасьць

Па Бярэзінскім раёне налічваецца 4.685 няпісьменных. Ахоплена ліквідыктамі 4.414 чал. Малапісьменных —6.808, ахоплена школамі—3.524 чал.

Але калі прыняверэцца больш пільна, дык гэтыя лічбы выявяцца да 50-60 проц.

Накіраваньня для праверкі ў сельсаветы брыгады камсамольскага актыву выявілі зусім нездавальняючы стан работы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Падручнікаў на ліквідыктах не хапае. Апрача таго, на ліквідыкты дасланы падручнікі на чуваскай мове. Пісьмовых прылад таксама няма. У часе дэкадніка атрыманы па два сэшыткі на трох няпісьменных. Няма алаш і ніхто не клапоціцца, каб імі забясьпечыць ліквідыкты.

Сетка ліквідыктаў па раёне выстарчальная і пры належнай пастаноўцы работы, можна было-б з посьпехам змагацца за суцэльную пісьменнасьць. Але-ж навядваюць ліквідыкт толькі 40-50 проц. і якасьць вучобы вельмі нізкая.

Пытаньні аб ліквідацыі няпісьменнасьці на бюро РК КП(б)Б ні разу не сталі. Толькі адзін раз у пачатку ступеня гэта пытаньне стаялася на прэзыдыуме **РВК.** Іншыя арганізацыі, як райпрафсавет, райспажыўсаюз і райкалгасаюз справай ліквідацыі няпісьменнасьці зусім не займаліся.

Напрыклад, райпрафсавет адмёўся ад дакладзіць больш чым фармальна. Заслухаўшы на сваім пасяджэньні інфармацыю аб ліквідацыі няпісьменнасьці ён прыняў літаральна наступную пастанову: **«усім месцкомам і райкомам даць дакладныя весткі — колькі ёсьць у іх няпісьменных і якія ёсьць сродкі для работы па ліквідацыі няпісьменнасьці».**

На жаль, і гэта палажэнка зьвялася ў стале райпрафсавету і далей нікуды не пайшла. Старшыня райпрафсавету таў. Аніцым фактычна зрывае работу.

Райкалгасаюз і спажыўсаюз лічаць работу на барацьбе за суцэльную пісьменнасьць чужой, якая іх зусім не датычыць.

Некалькі расхаруўпьнася камсамольская арганізацыя. Яна ўжо ў другі раз на ўсе сельсаветы накіравала брыгады для выкананьня там работы. Трэба зараз-жа і райкому партыі і іншым арганізацыям больш сурёзна заняцца справай ліквідацыі няпісьменнасьці з тым, каб нарэшце пыртыі і ўраду была своечасова выкавана.

А. ЮЖЫК.

Рэдактар шматтыражкі ў сьпісах... няпісьменных

Паводле вестак, ахват няпісьменных па г. Бабруйску — 85 проц. і па раёне — 82 проц.

Сапраўды-ж становішча такое, што выкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб **поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці да 1-га мая** стаіць пад простай пагрозай зрыву.

Азнаямленьне са становішчам ліквідацыі няпісьменнасьці **абяргае** афіцыяльныя весткі. Напрыклад, па горадзе, такія буйныя прадпрыемствы, як **дрэваапрацоўчы камбінат і шэйная фабрыка,** маюць значныя прарывы. Да гэтага часу камбінат ня мае дакладнага вучоту няпісьменных. **Выяўлены такія дзікія выпадкі, калі тым, што скончылі 4-5 груп школы, або... рэдактар шматтыражкі быў залічаны ў няпісьменныя і наадварот.** Ахват ліквідыктамі на сёньняшні дзень зусім не здавальняючы — калі 50 проц. Навучаньне дрэннае. Калі 50 дапрызыўніку няпісьменныя і сярод іх не праводзілася работа. Панавае настрой, што ліквідацыяй няпісьменнасьці павінен займацца толькі аддзел народнай асьветы.

Цяпер зроблен рэзкі пералом. Ідзе пэрсанальная праверка ўсіх рабочых. Наладжваецца дакладны вучот. На цэхкомы ўскладзена адказнасьць за ахват няпісьменных. Арганізаваны 13 ліквідыктаў. Арганізаваны рэйды брыгад і г. д. Фабком выдучыў 1.000 руб. для прэміяваньня. Пашыраецца работа па рэалізацыі газыкі. Пры фабкоме створана апэрацыйная тройка, а пры цэхкомах кантрольныя пасты.

У значнай частцы сельсаветаў раёну справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці ўсё яшчэ дрэнная. На плянуме РК саюзу прапасьветы рабілі інфармацыю 5 селькомаў. Ахвата няпісьменных у гэтых сельсаветах—80-100 проц., але зусім нездавальняюча з навучаньнем. Напрыклад, у **Паўлавічскім** сельсавеце навучаньне — 60 проц., у **Турксўскім** — 30-75 проц.

Упаўнаважаныя ад усіх 5 сельсаветаў скардзіліся на поўную адсутнасьць дапамогі з боку сельсаветаў і калгасаў.

Адчуваецца зусім слабая ўвага і вялікапільнічая канкрэтная дапамога з боку кіруючых раённых арганізацый. Пастановаў многа. Але мала канкрэтных спраў.

Камсамольская арганізацыя раёну бяздзейнічае. На працягу трох дзён нельга было знайсьці па горадзе хоць-бы некалькі камсамольскіх актывістаў для пасылкі з брыгадамі ў сельсаветы.

Бабруйшчына пагражае адставаньне, а гэта азначае — невыкананьне дырэктывы партыі і ўраду.

Яшчэ ня зусім позна. Трэба пабальшавіцку ўзяцца за працу, павялічыць норму заняткаў у дэкаду і выйсьці з прарыву.

Бабруйшчына, як і ўся БССР, павінна стаць суцэльна пісьменным раёнам да 1 мая 1932 году.

Акулін.

Сельсаветы ўключаюцца ў разгорнутую барацьбу

Па **Старобінскім** раёне дэкадзік генэральнай праверкі ўзарушыў увесь сяўецкі і партыйны актыў. У сельсаветы пасланы брыгады для дапамогі. Больш 60 чалавек з раённага актыву мабілізаваны і пасланы ў розныя куткі раёну.

Кожны дзень брыгадзіры, яны-ж і ўпаўнаважаныя РК і РВК, інфармуюць аб ходзе кампаніі па тым ці іншым сельсавеце. Усе сельсаветы, за выключэньнем самога **Старобінскага,** уключыліся ў разгорнутую барацьбу за суцэльную пісьменнасьць.

Райкалгасаюз на нарадзе старшынь усіх калгасаў раёну паставіў пытаньне барацьбы за пісьменнасьць в усёй воспрасьлю. Прынят цэлы рад канкрэтных мерапрыемстваў. Нарада калгасных старшынь Старобінчыны выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва калгасы **Чырвона-Слабодзкага** раёну па стопроцэнтным ахвце ліквідыктамі ўсіх няпісьменных і школамі—малапісьменных на завяршэньні да 1 мая ў раёне ліквідацыі няпісьменнасьці.

Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б
ТАРАЙКОВІЧ.

„Чырвоны мэталіст" дабіўся пералому

ВІЦЕБСК. (Наш кар.) Першая дэкада сакавіка дала на заводзе **«Чырвоны мэталіст»** значны пералом у бок ліквідацыі адставаньня ў выпуску пасеўных і ўборачных машын. Прамфінплян за гэту дэкаду ў сярэднім выкананы на 100,5 проц. Канчаткова наладжан выпуск балотных плугоў «Эбэргард». Правільная расстаноўка рабочай сілы, узмацненьне кантролю над якасьцю прадукцыі, вылучэньне спэцыяльных машын для вырабу дэталяй для плугоў—далі магчымасьць выканаць праграму па плугох «Эбэргард» на 192 проц.

Дзякуючы пераводу коўшчыкаў зуб'яў на прагрэсыўную зьдзельшчыну і замене фрэзэроўкі іх на балтарэзцы шляхам падкадкі на паветраным молаце, ліквідаваны недахват у зуб'ях. На працягу студзеня і лютага недахват зуб'яў зьяўляецца адной з асноўных прычын невыкананьня праграмы вырабу боран «Зыг-заг». Усё-ж праграма выпуску боран выканана толькі на 88,2 проц. Гэта тлумачыцца тым, што ў першай пяцідневцы заводзкія арганізацыі ня здолелі з за адсутнасьцю гаек $^{7}/^{16}$ пераключыцца на гайкі $^{7}/^{16}$ і праграма за першую пяцідневку выканана ўсяго на 64 проц; другая пяцідневка дала ўжо 111,4 проц.

Захест прадугледжаных плянам 128 бульбакапалак за першую дэкаду сакавіка выпушчана 88 шт., бо лицейны і такарны цэхі толькі ў апошнія дні асвоілі правільную фармоўку і сьвідроўку цянэтнай каробкі. Апошнія дні даюць выкананьне праграмы па бульбакапалках на 105-111 проц.

Пасьпяхова выконваецца заданьне па вырабе жмыхадрабілак і кораньрэзак. За 10 дзён сакавіка плян па жмыхадрабілках выканан на 110 проц., па кораньрэзках на 108,9 проц.

Пералом у рабоце заводу дасягнут дзякуючы перабудове работы заводзкіх арганізацый. Апошнія апэрацыйна кіруюць цэхамі і брыгадамі, уваходзяць у «дробязі» вытворчасьці, вывучаюць прычыны непаладак і прымаюць тэрміновыя меры для іх ліквідацыі. Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал мабілізаваны на своечасовы і добраякасны выпуск с.-г. машын.

Трэба адзначыць, што далейшае выкананьне праграмы, з-за дрэннага забесьпячэньня заводу чыгунам і сталёвым ліцьцём (запас сырыу на заводзе мізэрны) пад пагрозай. Белмэталяабяднаньне і Кантора Стальзбыту павінны прыняць самыя тэрміновыя і рашучыя меры для спабжэньня заводу сырцом.

Б. Сідаровіч і В. Васютовіч

6 УМОЎ тав. СТАЛІНА—ВА ЎСЕ ЗЬВЕНЬНІ ТРАНСПАРТУ

Выкананьне народна - гаспадарчага пляну чацьвертага, заключнага году першай пяцігодкі патрабуюць ад чыгуначнага транспарту значнага павышэньня тэмпаў работы.

3-ці эксплёатацыйны раён (Аршанскі) мае пэўны зрух у выкананьні раду паказальнікаў транспфінпляну. Павялічыўся сярэднісутачны прабег пасажырскага паравоза: пры заданьні ў 270 клм. у лютым выканана 284,2 клм., у першай дэкадзе сакавіка—276,5 клм. Узрасла сярэднісутачная нагрузка, дасягнуўшы ў лютым 306,2 вагона, пры заданьні ў 297 вагонаў. Сярэднісутачная выгрузка ў лютым склала 539,9 вагона пры заданьні ў 490.

Побач з гэтымі станоўчымі фактамі, якія бязумоўна сьведчаць аб некаторым паляпшэньні работы чыгунак, трэба адзначыць, што па радзе важнейшых паказальнікаў работа застаецца нездавальняючай. Нізкая камэрцыйная хуткасьць. Сярэднісутачны прабег таварнага паравоза і вагона не дасягае нормы. Адпраўка цягнікоў паводле раскладу дасягае ў лютым па пасажырскіх 80,5 проц., па таварных—60,3 проц., а ў першай дэкадзе сакавіка адпаведна—80,4 проц. і 77,1 проц.

Надзвычай слаба выконваецца дырэктыва партыі і загад народнага камісара шляхоў зносін тав. **Андрэева** аб павялічэньні сярэднісутачнай работы паравоза мінімум на адну гадзіну і павялічэньні сярэднісутачнай работы вагона. У лютым сярэднісутачная работа таварнага паравоза раўнялася 8,5 гадзіны, а таварнага вагона —3,11 гадзіны.

Усё яшчэ вялікі процант непрадукцыйных простояў паравозаў і вагонаў. У лютым прастой таварнага паравоза у асноўным дэпо пры заданьні ў 7,37 гадзіны фактычна складаў 8,1 гадзіны. Прастой вагонаў пад грузавымі апэрацыямі пры заданьні ў 27,4 гадз. складаў 29 гадзін.

Пераход на спаравую язду бязумоўна ўнёс аздараўленьне ў паравозную гаспадарку. Але-ж барацьба за замацаваньне спаранай партыйнымі і прафарганізацыямі не разгорнута ў належнай ступені. За апошні час нават наглядаецца павялічэньне ліку зрываў спаранай. У студзені было 116 зрываў, у лютым—165. Трэба адзначыць, што сыстэма арганізацыйных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў загадзе тав. Андрэева і якія спрыяюць замацаваньню спаранай, ажыцьцяўляюцца ў раёне зусім слаба. Неўпарадкаван выклік брыгад. У рабоце парадчыкаў ёсьць рад недахопаў. Яшчэ ня ўсюды заведзен улік зрываў і неадкладнае рэагаваньне на іх.

Становішча паравознага парку нездавальняючае; процант хворых паравозаў, у лютым перавышае заданьне на 1 проц. Некалькі лепшае становішча вагоннага парку, хаця і тут процант хворых вагонаў яшчэ высокі. Абменныя пункты ў Воршы і Менску яшчэ не перабудаваліся сваёй работы і ў большасьці толькі фіксуюць дэфэкты, а не змагаюцца па-сапраўднаму за аздараўленьне вагоннай гаспадаркі.

Пасьпяховае выкананьне трансфінпляну ў значнай меры залежыць ад працоўнай дысцыпліны. Лік прагулаў па няўважлівых прычынах у студзені складаў 155 чалавекадзён. Растуць здарэньні выключна па віне нядбайных адносін агентаў, зьвяза ных з рухам цягнікоў. Асабліва слабая дысцыпліна наглядаецца ў дэпо Ворша і Барысаў.

Нельга не адзначыць таго, што ў радзе месц асобныя камуністы і камсамольцы не паказваюць яшчэ прыкладу сацыялістычных адносін да працы. У студзені накладзены спагнаньні за парушэньне працдысцыпліны на 60 членаў КП(б)Б і ЛКСМБ. Гэта сьведчыць аб тым, што як партыйныя, так і прафсаюзныя арганізацыі яшчэ не паставілі барацьбу за працдысцыпліну на прынцыповую вышыню. Праўда, за апошні час на станцыі Ворша пачалі ўжываць масавыя мерапрыемствы па барацьбе за працдысцыпліну (нарады прагульшчыкаў, вывешваньне плякатаў-карыкатур на парушальнікаў працдысцыпліны і г. д.). Аднак, гэты вопыт яшчэ не пашырэн.

Прыведзены кароткі аналіз работы трэцяга эксплёатацыйнага раёну паказвае, што выкананьне важнейшых вымагальнікаў праходзіць нездавальняюча. Гэта тлумачыцца галоўным чынам тым, што **партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі раёну яшчэ не разгарнулі бальшавіцкай барацьбы за поўную рэалізацыю 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна.**

Рэалізацыя 6 умоў т. Сталіна зьяўляецца асноўным сродкам барацьбы за бальшавіцкія тэмпы работы. Між тым работа ў раёне яшчэ не перабудавана па-новаму. У радзе выпадкаў назіраецца самацёк, бясплянавасьць, праваапартуністычная бязьдзейнасьць. Узор работы па-старому паказала кіраўніцтва ячэйкі і МК паравозных брыгад нанэўровага руху дэпо Ворша. Пастановай бюро парткалектыву сакратар гэтай ячэйкі зьнят з работы, а бюро ячэйкі распушчана і прыцягнута да партадказнасьці.

Па лініі арганізацыі працы, ліквідацыі абязьлічкі і правільнай расстаноўкі рабочай сілы праведзена невыстарчальная работа. Праўда, брыгады па рамонце паравозаў разбуйнены. Праведзена прымацаваньне рабочых да варштатаў, стрэлачных пастоў, сыгналаў і г. д. Аднак, адсутнічае выразнае разьмежаваньне функцый паміж пасасобнымі работнікамі. У выніку наглядаецца рад фактаў бесгаспадарчасьці і безадказнасьці. Праверка выкананьня зьверху да нізу пастаўлена зусім слаба.

Дрэнна справа стаіць з расстаноўкай і скарыстаньнем кваліфікаванай рабочай сілы. Напрыклад, па дэпо Ворша аўтаматчык 8-га разраду выконвае работу, якую можна даручыць сьлесару 3-га разраду; кацельшчыкі 7-га разраду выконваюць работу чорнарабочых.

Надзвычай важным мерапрыемствам у справе арганізацыі працы зьяўляецца апэрацыйна-сутачны плян. Гэты вопыт праводзіць дэпо Ворша. Ён даў значны зрух у рабоце. У апэрацыйна-сутачным пляне прадугледжваецца пастаноўка паравозаў у рамонт, выпуск з рамонту, падача іх пад нагнікі і г. д. Апрача гэтага распрацоўваецца графік, паводле якога разьмяркоўваецца работа паміж асобнымі рамонтнымі брыгадамі, з канкрэтнымі указаньнем тэрмінаў выкананьня тэй ці іншай работы. Правядзір, атрымаўшы заданьне, расстаўляе рабочых па асобных аб'ектах рамонту, праводзячы да гэтага кароткую вытворчую нараду.

У справе рэарганізацыі сыстэмы заработнай платы і ліквідацыі ўраўнілаўкі зроблена надзвычай мала. Так, сярэдні заработак сьлесара дэпо Ворша ў студзені складаў 155 руб., а маляра—255 руб.; кваліфікаванага токара—160 руб., а токара-бандажніка больш нізкай кваліфікацыі—255 руб. Ёсьць нават выпадкі, калі чорнарабочы і малакваліфікаваны рабочы зараблялюць больш кваліфікаванага. Так, прамывальшчык паравоза ў студзені атрымліваў 122 руб., а кваліфікаваны рабочы-трубавар—121 руб.; прабівальшчык труб—123 руб. і меднік —123 руб і г. д.

Прафсаюзныя арганізацыі зусім слаба займаюцца пытаньнямі перабудовы заработнай платы і нармаваньня працы. Задача заключаецца ў тым, каб на бальшавіцку правесьці перабудову сыстэмы заработнай платы ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду. Дробна-буржуазная ўраўнілаўка павінна быць знесена зьнішчальным ударам.

Ва ўсю шырыню неабходна паставіць пытаньне аб паляпшэньні работы каапрацы. У гэтай справе некаторы зрух ёсьць. Павялічылася сетка крам і сталовых, узрос таварааварот і г. д. Аднак, казэнрацыя яшчэ не перабудавалася цалкам тварам да вытворчасьці. Сталоўка яшчэ ня стала цэхам прадпрыемства. Якасьць абслугоўваньня ня нізкая.

Параўнальна здавальняючая пастаўлена справа падрыхтоўкі кадраў і аўладаньня тэхнікай вытворчасьці. Курсамі, гурткамі і завочнай тэхвучобай ахоплена 2.887 чалавек. Неабходна ўмацаваць кіраўніцтва падрыхтоўкай кадраў з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый. ІТР павінны актывізаваць сваю работу ў справе канкрэтнай дапамогі разгортваньню тэхнічнай вучобы. Трэба сказаць, што да гэтага часу ўзятыя на слабе абавязацельствы шмат ІТР невыстарчальна рэалізуюць.

Асабліва слабым вучасткам зьяўляецца ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў сыстэму гаспадарчай работы. Хаця фармальна ўсе зьвеньні раёну лічацца пераведзенымі на гаспадарчы разрахунак, але-ж па сутнасьці гэта далёка не так. Фактычна кантроль рублём адсутнічае. Сыстэма мер, якая зьвязана з пераходам на гаспадарчы разрахунак, не праводзіцца. У выніку ўсё яшчэ ў наяўнасьці бесгаспадарчасьць, безадказныя адносіны да разьмеркаваньня і скарыстаньня абаротных сродкаў, слабае скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, значныя перарасходы супроць лімітаў, парушаецца фінансавая дысцыпліна. Толькі па адным аршанскім дэпо за чацьверты квартал 1931 году перарасход складае 272.867 руб.

Узьнік вынікаў работы пастаўлен зусім дрэнна, праводзіцца са спазьненьнем на некалькі месяцаў. Вынікі работы не даводзяцца да рабочых. Трэба проста сказаць, што партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі раёну недапушчальна мала працуюць у справе ўкараненьня гаспадарчага разрахунку, у справе арганізацыі выразнага ўліку.

Работа партыйных ячэек і месцкомаў не перабудавана пад кутом перанясеньня цэнтру цяжару яе ў низавое зьвяно. Прафсаюзныя арганізацыі не праводзяць с

ПОЛЬСКІЯ ГАРНЯКІ ТРЫМАЮЦЦА СТОЙКА

Паліцэйскі тэрор узмацняецца

ВАРШАВА, 14. Забастоўка гарнякоў ня спыняецца. Прадпрыемцы кінуцца пры даламозе штрэйкбрэхераў зламаць салідарны фронт бастуючых. Узмацняецца адміністрацыйны і паліцэйскі тэрор. Пэпэсаўскія прафбюракраты са свайго боку падрыхтоваюць глебу для зрыву забастоўкі.

Буржуазная прэса зьмяшчае ілжывыя правакацыйныя весткі аб «правале забастоўкі». «Весткі пярэчаць адна другой і ўзаемна перакрэсьліваюцца.

А забастоўка — наперакор усяму гэтаму — адбываецца далей. Гарняки салідарна бастуюць. На сходах і мітынгах выносіцца пастановы — баставаць аж да перамогі.

Жудасная галеча сярод польскіх гарнякоў

Ужо больш, чым тры тыдні вугальныя басэйны Дамброва і Кракава зьяўляюцца арэнай напружанай клясавай барацьбы. Больш, чым тры тыдні маўчаць капальні, ня дымяцца заводзкія трубы. Больш, чым тры тыдні бастуюць дзесяткі тысяч польскіх гарнякоў.

За гераічнай барацьбой дамброўскіх і кракаўскіх пралетараў з прытоеным дыханьнем сочаць ня толькі рабоча-сялянскія масы Польшчы. Забастоўка польскіх гарнякоў знаходзіць самы жывы водгук у радах міжнароднага пралетарыяту, сярод мільёнаў працоўных усяго сьвету.

Вугольныя бароны Польшчы павялі грабежніцкае наступленьне на зарплату гарнякоў, імкнучыся вынесьці свае паражэньня вострым эканамічным крызісам эксплёатарскія інтарэсы на сьпінах шматтысячных рабочых мас. Капіталісты Дамброўскага і Кракаўскага вугольных басэйнаў, апэтыты якіх, ня гледзячы на крызіс, растуць, хочуць узьнаць канкурэнтаздольнасьць польскага вугалю за кошт зьніжэньня і без таго нізкага жыцьцёвага ўзроўню польскіх гарнякоў, УЗРОЎНЮ САМАГА НІЗКАГА Ў ЭЎРОПЕ.

У якіх жудасных умовах жывуць польскія гарняки і іх сем'і, якую галечу яны церпяць, найвыразьней за ўсё сьведчыць карэспандэнцыя, зьмешчаная ў адным з апошніх нумароў сацыял-фашысцкага «Роботніка», якога нельга западозрыць у згушчэньні фарбаў. Адзін з дактароў Дамброўскага басэйну ў адказ на пытаньне карэспандэнта сацыял-фашысцкага органу аб здароўі наймалодшага пакаленьня рабочых вугольных басэйну — дзяцей гарнякоў, заявіў наступнае:

«Больш 10 год маю справу з дзецьмі. У сваёй доктарскай практыцы мне ня прыходзілася бачыць больш зморaных дзіцячых арганізмаў, чым тут. ЗМОРАНЫЯ ГОЛАДАМ ДЗЕЦІ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ТЫПОВЫМ ПРЫКЛАДАМ РАХІТЫЧНАГА ДЗІЦЯЦІ. 12 і 14-гадовыя хлапчукі і дзяўчаты знаходзяцца на ступені разьвіцьця 7 і 10-гадовых дзяцей. ХУДЫЯ, БЛЕДНЫЯ, СУХОТНЫЯ — ЖЫВЫЯ ШКІЛЕТЫ».

Думка настаўніка пачатковай школы: «Вясной, летам і раньняй восенью наведваньне школы больш-менш нармальнае. Але як толькі надыходзяць асеньнія халады, колькасьць дзяцей, якія наведваюць школу, ЗНІЖАЕЦЦА ДА МІНІМУМУ. НЯ МАЮЦЬ ВА ШТО АПРАНУЦЦА; БЯЗ ВОПРАТКІ І БОТАЎ НЕМАГЧЫМА ХАДЗІЦЬ У ШКОЛУ».

У заключэньне «Роботнік» піша: «На 10.000 чалавек памірае ад сухотаў у польскіх вугольных басэйнах 40 АСОБ, у Варшаве — 23, у Заходняй Эўропе — толькі 17. ГАЛЕЧА І СУХОТЫ — ГЭТА НЕАДЛУЧНЫ ТАВАРЫШ ДОЛІ ГАРНЯКА».

За кошт жыцьцёвага ўзроўню рабочых вугольныя «каралі» Польшчы хочуць нажыць сабе новыя мільёны.

Пад кіраўніцтвам кампартыі польскія гарняки змагаюцца зараз супроць наступленьня капіталу, супроць барбарскай эксплёатацыі за свае кроўныя інтарэсы, супроць фашысцкай дыктатуры. Забастоўка гарнякоў Дамброўскага і Кракаўскага басэйнаў зьяўляецца па сутнасьці забастоўкай палітычнай, наперакор усім намаганьням сацыял-фашыстаў вытруціць з яе гэты характар.

Т.

Масавыя арышты ў Варшаве

ВАРШАВА, 14. 11 сакавіка ахранка зрабіла вобыск у памяшканьні «таварыства незалежных сацыялістаў» (група 2½ Інтэрнацыяналу), дзе адбываўся вечар, наладжаны таварыствам моладзі «Прагрэс». Пасьля вобыску ўсіх было арыштавана 138 чал.

Усеагульная аднадзённая забастоўка-пратэсту Польшчы

ВАРШАВА, 14. Пад націскам рабочых нізоў праўленьне пэпэсаўскіх прафсаюзаў склікала ў Катавіцах (Верхняя Сілезія) делегацыі сход. Рабочыя аднадушна паставілі абвясьціць на 16 сакавіка аднадзённую ўсеагульную забастоўку пратэсту супроць спробы прадпрыемцаў ліквідаваць апошнія рэшткі сацыяльных заваёваньняў рабочых.

Барыкады на гуце „Гартэнзія"

ВАРШАВА, 14. Паводле паведамленьня з Петракова, там ужо больш шэсьці тыдняў цягнецца забастоўка на гуце «Гартэнзія». Рабочыя заняли фабрыку і пабудавалі барыкады. Нават канцылярскія служачыя заводу не дапускаюцца на фабрыку. Інспэктар працы, які абсьледаваў становішча на месцы, заявіў, што такой згуртаванай і баявой забастоўкі не наглядалася з часу вайны.

Чуткі аб зьменах у польскім урадзе

ВАРШАВА, 12. Проса фашыцкай Польшчы паведамляе, што ў хуткім часе мае адбыцца зьмена ў складзе польскага ўраду. Проса піша аб магчымасьці выхаду з ўраду міністра прамысловасьці і гандлю Зартыцкага, міністра юстыцыі Міхайлоўскага, міністра працы і грамадзкай апекі Губіцкага і міністра зямельных рэформ Казлоўскага.

ЯПОНЦЫ ПАДРЫХТОЎВАЮЦЦА ДА ЗАХВАТУ ШАНЬДУНІ

Канцэнтрацыя флёту ў Цындао

БЭЙПІН, 14. Паводле паведамленьня «Сінбун Рэнга» ў Цындао «пашырыліся чуткі» аб маючых адбыцца сутычках японскіх войск з войскамі Хань-Фу-чу (старшыня Шаньдунскага провінцыйнага ўраду). У сувязі з напружаным становішчам у Шаньдуні — паведамляе агэнцтва, — 14 сакавіка ў Цындао прыбудзе японскае флягманскае судно другой эскадры «Кума». Зараз у Цындао знаходзіцца крэйсэр «Якуіс» (Цындао буйны морскі порт ў Шаньдуньскай провінцыі. Канчатковы пункт Шаньдуньскай чыгункі).

Акупанты наводзяць „парадак" у Харбіне

БЭЙПІН, 12. 11 сакавіка ў Харбіне пакарана сьмерцю некалькі кітайцаў, западозраных у прыналежнасьці да кітайскай нацыянальнай тэрарыстычнай арганізацыі. Галовы пакараных з мэтай «запалохваньня» выстаўлены на пляцы ў Вудзядзянс. Абвешчана, што такія-ж захады будуць ужыты да ўсіх тых, хто будзе «перашкаджаць дзейнасьці ўлады».

Выкрыцьцё загавору ў Нандао

ШАНХАЙ, 14. Паводле патрабаваньня кітайскіх улад паліцыя французкай канцэсіі з міжнароднага сетльмэнту арыштавала групу кітайцаў, якія замышлялі скінуць існуючую кітайскую ўладу ў Нандао (раён Шанхаю) і захапіць гэты раён узброенай сілай. Сярод арыштаваных былі дарадца японяга манчжурскага імпэратару Пу-і (цяперашняга кіраўніка новай манчжурскай дзяржавы). Згодна паведамленьня «Норд чайна дэйлі н'юс», у змове прымала ўдзел некалькі афіцэраў, займаючых важныя ўрадавыя пасты. Паліцыя захапіла шмат дакумэнтаў, выкрываўных пляны змоўшчыкаў, розныя значкі, спэцыяльныя пропускі, якія сьведчылі аб намеры змоўшчыкаў стварыць «паўднёва - ўсходнюю армію самаабароны». У змоўшчыкаў быў дэтальна распрацаван плян захвату гораду па вучастках. Чакаюцца сэнсацыйныя выкрыцьці.

У Нандао абвешчана ваеннае становішча. Звыш 4.000 паліцэйскіх і некалькі тысяч кітайскіх добраахвотнікаў з куямётамі ахоўваюць Нандао. Такім чынам, паўстаньне, якое чакалася 13-III праваліцца. (ТАСС).

НОВЫ ЎЗДЫМ ЗАБАСТОВАЧНАЙ БАРАЦЬБЫ Ў ГІШПАНІІ

Сялянства захапляе памешчыцкія маёнткі

ПАРЫЖ, 13. У сялянскіх раёнах Гішпаніі адбыліся шматлікія выступленьні батракоў і сялянскай беднаты. У прыватнасьці, у Альмэндра дэманстранты патрабавалі ладзелу камунальных земляў. У Альхаме 300 сялян захвацілі памешчыцкія землі. Жандары атакавалі сялян.

У многіх прамысловых раёнах узмацняюцца хваляваньні рабочых мас у сувязі з капіталістычнай рацыяналізацыяй, звальненьнямі рабочых і зьніжэньнем зарплаты. У Аніеда і Більбао ідзе падрыхтоўка да барацьбы ў сувязі з маючымі адбыцца масавымі звальненьнямі рабочых. У Рамбле беспрацоўныя аўладалі вуліцай, разграмілі булачныя, адбылася сутычка з жандармэрыяй. Дэманстрацыі рабочых адбыліся таксама ў Гранадзе і ў Хіроне, прычым рабочыя, да якіх далучыліся некалькі соцень сялян, наладзілі галодны паход у Альмэрыю. У Татуане адбылася дэманстрацыя тысячы беспрацоўных з патрабаваньнем работы і хлеба, а таксама дэманстрацыі некалькіх соцень беспрацоўных з воклічамі: «Няхай жыве СССР», «Няхай жыве камунізм».

***

ПАРЫЖ, 13. З Гішпаніі паведамляюць аб масавых забастоўках і выступленьнях рабочых. У Аліканце працягваецца ўсеагульная забастоўка служачых гандлёвых прадпрыемстваў, у якой прымае ўдзел 5.000 чал. у знак салідарнасьці з бастуючымі служачымі. У Кардове абвешчана ўсеагульная забастоўка. Бастуючыя патрабуюць вызваленьня арыштаваных рабочых і дазволу выхаду закрытых рабочых газэт.

Да бастуючых далучыліся рабочыя, члены рэфармісцкіх прафсаюзаў.

Усе стратэгічныя пункты заняты войскамі. Праведзены шматлікія арышты. Бастуючыя рабочыя дэманстравалі па вуліцах і білі шыбы ў магазынах. Камуністычныя і сындыкалісцкія арганізацыі закрыты.

4 сакавіка пачалася забастоўка батракоў правінцыі Харэн, у Балахове адбыліся дэманстрацыі беспрацоўных. Дэманстранты атакавалі харчовыя магазыны і асадзілі казармы грамадзянскай гвардыі. Казармы былі вызвалены толькі пасьля прыбыцьця жандарскіх падмацаваньняў. Праведзены шматлікія арышты. У Пузбля — Дэ-Бальвэрдзе батракі і сяляне захвацілі памешчыцкія маёнткі. У Аліканце закончылася перамогай забастоўка партовых рабочых. У Таледа закончылася 48-гадзінная забастоўка пратэсту ў сувязі з беспрацоўем. Забастоўка была арганізавана камуністамі. Праведзены масавыя арышты. (ТАСС).

18-га САКАВІКА—НАРАДА РАБОТНІКАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ І РЭДАКТАРОЎ ШМАТТЫРАЖАК

18-га сакавіка, роўна ў 6 гадзін увечары, у памяшканьні дому пісьменьнікаў (Савецкая вуліца, дом 68) культпропам ЦК КП(б)Б склікаецца нарада работнікаў цэнтральных газэт БССР разам з рэдактарамі менскіх фабрычна-заводзкіх шматтыражак, цэхавых штодзенак, рабкорамі і студэнтамі газэтнага аддзяленьня Камвузу.

У парадку дня:

1. Даклад загадчыка рабселькораўскім аддзелам «Правды» тав. ГАРЭЛІКА аб чарговых задачах рабселькораўскага руху.

2. Аб далейшай рабоце па конкурсе «Правды» і ўсебеларускім сталінскім паходзе-спаборніцтва фабрычна-заводзкага друку.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

19-га сакавіка г.г., у 6 гадз. вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б

СКЛІКАЕЦЦА

аб'яднаны пленум Менгаркому і гар. КК КП(б)Б

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы (дакл. тав. Якубовіч).

2. Аб падрыхтоўцы да будаўніцтва па прамысловасьці і камунальнай гаспадарцы (Дакл. т.т. Басарман і Валодзька).

Апрача членаў і кандыдатаў гаркому і гар. КК КП(б)Б на пленум запрашаюцца.

Па першым пытаньні—сакратары вясковых парт'ячэек; па другім пытаньні—сакратары парт'калектываў прадпрыемстваў і будаўнічых арганізацый.

Менгарком КП(б)Б.
Мен. гар. КК КП(б)Б

15-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ „ИЗВЕСТИЙ"

Прывітаньне ад ЦК УсеКП(б)

ЦК УсеКП(б) вітае цэнтральны орган саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў у дзень яго 15-цігадовага юбілею.

На працягу 15 год «Известия» стаялі ў першых радох барацьбітоў за дыктатуру пралетарыяту. За гэты пэрыяд «Известия» з гонарам выконвалі свой абавязак сейбіта ідэй ленінізму, збіраючы вакол саветаў мільённыя масы беспартыйных рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. ЦК УсеКП(б) упэўнен, што «Известия» і ў далейшым будуць выконваць свой абавязак перад рабочымі і сялянамі СССР, перад вялікай краінай Саветаў.

ЦК УсеКП(б).

Прывітаньне рэдакцыі ад прэзыдыюмаў ЦВК СССР і РСФСР

Прэзыдыум ЦВК СССР і ЦВК РСФСР зьвярнуўся з прывітаньнем да рэдакцыі, рабочых і супрацоўнікаў «Известий ЦВК СССР і ЦВК РСФСР» з прычыны пятнаццацігадовага юбілею газэты.

Прэзыдыумы ЦВК СССР і РСФСР лічаць асаблівай заслугай газэты штодзённы актыўны ўдзел яе ў барацьбе і практычным правядзеньні ў жыцьцё важнейшых бягучых канкрэтных пытаньняў савецка - гаспадарчага будаўніцтва шляхам устанаўленьня жывой і непасрэднай сувязі з фабрыкамі і заводамі, з калгасамі і саўгасамі, з рабочымі і сялянскімі масамі.

Прывітаньне заканчваецца выказам цьвёрдай упэўненасьці ў тым, што і надалей «Известия» будуць падтрымліваць жывую сувязь з працоўнымі масамі ўсіх нацыянальнасьцей СССР, мабілізаваць іх вакол нязгінкага правядзеньня ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, заклікаючы іх да цьвёрдай і нязгінкай барацьбы з клясавымі ворагамі, да барацьбы за працоўную дысцыпліну, за павышэньне якасьці работы ўсіх работнікаў усіх зьвеньняў савецкага і гаспадарчага апарату.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Пабудова новай друкарні „Правды"

ЛЕНІНГРАД, 13. Пачаты работы па пабудове ў Ленінградзе адной з буйнейшых у Саюзе паліграфічных прадпрыемстваў — друкарні выдавецтва ЦО «Праўда». Друкарня прызначаецца для друкаваньня «Правды» для Ленінграду і вобласьці. Работа друкарні будзе цалкам мэханізавана, пачынаючы з працэсу падачы паперы і канчаючы ўпакоўкай газэт.

Новы хірургічны апарат

ЛЕНІНГРАД, 13. Завод «Буревестник» зрабіў першы савецкі апарат дынатэрміі, магутнасьцю ў 80 ват. Апарат дазваляе праводзіць аперацыі пры даламозе электрычнасьці з глыбінёю пароэу 8 млм. і хуткасьцю 35 сант. у 5 сэкунд. Новы хірургічны інструмант зноўкае прыстасаваньне, галоўным чынам, пры аперацыях горла, носа і вуха.

Сельгасмашыны

За першую дэкаду сакавіка Гомсельмаш выпусьціў 266 сілаасэрэзак—107,2 проц. апэрацыйнага пляну заводу, 151 сячкарню— 117,9 проц., 73 бульбамыйкі — 43,4 проц., 130 бульбасартовак — 108,3 проц. і 16 канюшынасартовак — 50 проц. Плян па заводзе ў цэлым выкапан на 100,5 проц.

***

За першую дэкаду сакавіка завод «Чырвоны мэталіст» выпусьціў 168 жмыхадрабілак — 110,5 проц. пляну, 183 карнярэзкі—108,9 проц., 88 бульбакапалак — 68,75 проц., 508 барон «Зіг-заг» — 88,2 проц., 25 плугоў аднакорпусных — 192,3 проц. і 41 плуг № 14—410 проц. пляну. Дэкадная праграма па заводзе ў цэлым выканана на 100,5 проц.

Варштатабудаўніцтва

За першую дзесяцідзеўку сакавіка завод «Камунар» (Менск) выпусьціў 36 ботанітавых варштатаў, або 14,4 проц. месячнага заданьня, 440 пар ціскоў—9,7 проц. месячнага пляну і 6 скатаў—3 проц. пляну. Недавыкананьне заданьня тлумачыцца тым, што зараз завод праводзіць загатоўку дэталяў, у выніку якое ёсьць шмат нескончанай прадукцыі.

Стандартныя дамы

За другую пяцідзеўку сакавіка Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат выпусьціў 9,2 стандартных дамоў, што складае 65,6 проц. заданьня.

Угнаеньні

За другую пяцідзеўку сакавіка крычаўскі фасфарытны завод выраблю 57 тон фасфарытнай мукі, што складае 12,3 проц. заданьня.

Будматар'ялы

Лесапіленьне. За другую пяцідзеўку сакавіка Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат выканаў сваю вытворчую праграму па лесацэху на 88 проц.—расьпілавана 3.358,2 кбм. сырцу; па заводзе №6 — на 89,5 проц. — расьпілавана 875,2 кбм.; па заводзе №7 на 78,7 проц. — расьпілавана 614,6 кбм.; па беладрэўным цэху — на 135,4 проц.—выпушчана прадукцыі 18.282 кбм.; па фанэрным цэху — на 92,5 проц. — выпушчана 480,3 кбм. фанэры.

***

Цьвікі. 11 сакавіка дрота - цьвіковы завод «Чырвоны Кастрычнік» выраблю 4.780 кгр. буданічных цьвікоў, або 72 проц. заданьня. Недавыкананьне заданьня тлумачыцца недахватам дроту.

Папера

За 9 і 10 сакавіка шклоўская папяровая фабрыка «Спартак» выпусьціла 43,5 тоны паперы, або 59,96 проц. заданьня.

10 сакавіка на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» (Чашнікі) з-за недахвату торфу працавала толькі адна самачарпалка, якая выраблю 9.204 кгр. паперы, або 69,7 проц. заданьня.

11 сакавіка на фабрыцы таксама працавала адна самачарпалка, якая выпусьціла 4.341 кгр. паперы, або 32,8 проц. заданьня.

Скура

За другую пяцідзеўку сакавіка гарбарня «Бальшавік» выпусьціла прадукцыі на 166.940 руб., што складае 116,62 проц. заданьня. У тым ліку першы хромавы цэх выпусьціў прадукцыі на 80.407 руб. — 126,64 проц. пляну і другі хромавы цэх — на 74.385 руб. — 117,37 проц.

***

За другую пяцідзеўку сакавіка віцебская гарбарня выпусьціла прадукцыі на 111.951 руб., што складае 123,7 проц., у тым ліку чырвонадубны цэх даў прадукцыі на 36.883 руб. —130 проц. заданьня, штампаваны цэх — на 74.329 руб. — 121,3 проц. пляну.

***

За другую пяцідзеўку сакавіка гомельскі аўчына-футравы завод «Пралетарскі шлях» выпусьціў прадукцыі на 21.512 руб.

Абутак

За 11 сакавіка гомельская абутковая фабрыка выпусьціла 3.134 пары абутку, або 104,5 проц. заданьня. Выпушчана 1.125 ботаў — 112,5 пр. проц. і 1.166 мужчынскага абутку—116,6 проц. пляну і г. д.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 19 і 20 сакавіка ў Асіпавічах і 22 сакавіка ў Пухавічах будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам т. Сьцяпняк па разглядзе наступных апэляцыйных спраў: на 19-III у Асіпавічах — Ільлюшэнка І. Я., Осіпаў П. Д., Валадкевіч А. С., Радзьвілін С. І., Тамілін П. В., Шутаў П. Х., Панькоў С. П., Рабчанка К. Р., Мароз А. Х., Ждановіч Ф. П., Мельнік М. Я. (Клічаў): на 20-III у Асіпавічах — Азолін Л. М., Дрозьдзік А., Канцыцкі А. А., Дядзюк В. П., Камлік К. Р., Карповіч А. А., Лях М. Я. (Асіпавічы), Яндульскі У. Л. (Сьвіслач), Пазьняковіч П. Н. (Ст. хут. Міхайлаўскі); на 22-III у Пухавічах — Боханя Я. П., Валчук Г. А., Гарбачык У. Р., Спаліс Ф. М., Шычко А. І., Шыцько Ч. В. (Пухавічы), Мількевіч У. А., Ждановіч І. А., Калячка Ц. П., Замбружыцкі Г. Я., Гайс М. М., Мартынавіч П. Р., Калтовіч С. Я., Грышчук С. Л., Гук Я. С. (Чэрвень). Яўка вышэйпамянёных т. т. на ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова. Праезд за свой кошт.

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 22-III у г. Віцебску будуць працаваць дзьве выязныя ПТ ЦКК КП(б)Б, адна—пад старшынствам тав. Блюштэйна, другая — пад старшынствам тав. Аверына, і ў г. Магілеве 22-III і 23 III пад старшынствам тав. Окаўронка па разглядзе наступных апэляцыйных спраў; 22-III (у г. Віцебску) пад старшынствам тав. Аверына: Мішура П. К., Кутьінскі Р. М., Шаплыка С. К., Бергер К. С., Ванчуліс Н. У., Фекета Р. П., Агеянка Ц. Н., Гальдрэй Б. Ф., Бобча К. І., Іваноў А. І., Левін Л. (Віцебск); 22 III (у г. Віцебску) пад старшынствам Блюштэйна: Алікеяў Т. С., Апанасенка М. К., Федараў Ф. Ф., Сокалаў М., Суслаў М. М. (Сураж), Ліпін Ю. А., Касецкі А. І., Селязьнеў І. М., Сьвярокі Б. В. (Лёзна); 22-III (у г. Магілеве) пад старшынствам Окаўронка: Мельнікаў Т. Я., Голубеў А. Я., Шэвелеў Г. С., Клімін К. Я., Авер'янаў А. Д., Спучкоў І. А., Гальперын Я. Р., Прыгоніс, Цемніцкі К. І., Чэробка А., Глухоўскі З. Д., Васільлеў Н. М., Любецкі Я. К., Сідараў П. Я., Запатылка М. К., Котаў Н. І., Сьцепаненка Л. Р. (Магілеў); 23-III (у г. Магілеве) пад старшынствам тав. Окаўронка: Осіпаў І. А., Отарэйтаў Е. П., Семашка В. Ф., Гаўрыленка Н. Ф., Варфаламаў С. Ф., Юрыеў М. Я., Каліпінскі, Сегаль П. П., Шкараў І. Д., Ушакоў Ц. С. (Чаусы), Окунеў Ф. Я., Каслоў В. П., Зайцаў В. К., Чупрынскі Х. П., Ясецкі З. Я., Сітавец П. Н., Рагавіцкі А. А. (Вялынічы), Мялешкін М. І., Парцінкін П. Ф., Кукушка М. А., Стаўпінскі М. Я., Карчагін І. Н., Калалеў С. Ц. (Шклоў). Яўка вышэйпамянёных т. т. на ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова. Праезд за свой кошт.

— 16 сакавіка, у 6 гадз. веч., у памяшк. гаркому КП(б)Б (3-ці паверх) адбудзецца парада ўсіх брыгадзіраў, выдзеленых гаркомам і гарКК па праверцы становішча партвыхаваўчай работы з новымі членамі і кандыдатамі КП(б)Б, сумесна з сакратарамі парт. калектываў і ячэек. Сакратарам ячэек камвузу, ВАН і энэргетычнага інстытуту забясьпечыць яўку сваіх брыгадзіраў.

— 18-III, у 11 гадз. раніцы склікаецца нарада прамадзкіх інспэктараў у памяшканьні ЦКК-НК РСІ (бюро скаргаў). Яўка абавязкова.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

АД 16 САКАВІКА

замежны фільм вытворч. „ОВЕР-film-Paris"

САЛАМБО

ГІСТАР. ТРАГЭДЫЯ ў 7 АКТАХ.
ПАВОДЛЕ РАМАНУ ГУСТАВА ФЛОБЭРА.

У ГАЛ. РОЛЯХ:
Саламбо—весталка багіні Танніт—ЖАННА ДЭ БАЛЬЗАН.
Гамількар—вайск. нач. Карфагену—ВІНТАР ВІНА.
Матэо—вайск. начальнік Ліві—РОЛА НОРМАН.
Спідэй—вораг Карфагену—АНРЫ БОДЭН.
Нар. Авао—прынц Нумідыі—РАФАЭЛЬ ЛЕВЭН.

ПАСТАНОЎКА РЭЖ. П'ЕРА МАРАДОН.

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ. ПАЧАТАК у 6 г., 7 г. 30 м., 9 г. і 10 г. 30 м.
КАСА—ад 1 гадз. дня. Дзеці ў кіно не дапускаюцца.
Пасьля III званка ўваход у залю закрыт.

Інтэрнацыянал — Каса—ад 12 г. дня
ПРАЛЕТАРЫ — Каса—ад 12 г. дня
СПАРТАК
РЫЧАРД ТОЛМЭДЖ у камэдыі САКРЭТ ХАРАСТВА. Кіно-хроніка—„НАШ УЛЬТЫМАТУМ"
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ Чэмпіён сьвету у 8 частках.
БРАНЯНОСЕЦ ПАЦЕМКІН ЗВЫШ ПРАГРАМЫ БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ у 2 частках

Згодна пастановы ВСНГ БССР ад 31-X-31 Гродзенскі торфазавод Белторфу з 1-1-32 г. ПЕРАДАЕЦЦА в актывам і пасьвам у веданьне Магілеўскай дзяржаўнай фабрыкі штучнага валакна „Магвалакнабуду"
Усе разьлікі з кантрагентамі па дзейнасьці торфазаводу да 1-га студзеня 1932 г. вытварае Магвалакнабуд—г. Магілеў, БССР. Бывалыя шасэ. Арганізацыі і асобы, якія маюць прэтэнзіі да Грабянецкага торфазаводу, абавязаны прад'явіць гэтыя Магвалакнабуду на працягу 2 тыдняў тэрміну са дня абвяшчэньня ў газэце, пасьля якога тэрміну прэтэнзіі прымацца не будуць.
За дырэктара Магвалакнабуду Емяноўсці.
Дырэктар Грабянецкага торфазаводу Палкін.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „Чырвоная Зорка"
ДЗЕННЫЯ гукавыя сэансы для дзяцей.
15, 16 і 17 сакавіка
гукавы фільм „КЕМ БЫЦЬ" у 4 частках.
Гукавы фільм „ПОШТА" у 2-х частках.
Пачатак у 1 гадз. і 2 г. 30 м.
Па калектыўных заяўках ад школ і дзіцячых арганізацый прадстаўляецца СКІДКА.

Беларускі Дзяржаўны Будаўнічы Інстытут АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ
студэнтаў на першы курс:
а) на адзіненькі фабрычна-заводзкага будаўніцтва—25 асоб (без адрыву ад вытворчасьці)
б) агро-індустрыяльнага будаўніцтва—25 асоб (з адрывам ад вытворчасьці)
З прычыны таго, што набор на фабрычна-заводзкае адзіненьне праводзіцца без адрыву ад вытворчасьці, асобы, прынятыя на гэта адзіненьне, падлягаюць абавязковаму пераводу на работы па будаўнічай спэцыяльнасьці.
Заявы з дакумэнтамі прымаюцца да 1 красавіка 1932 г. у канцылярыі Будаўнічага Інстытуту г. Менск, пр. Чырвонаармейскай і Ульянаўскай № 42/8.
Дырэктар Інстытуту Швайко

18 сакавіка, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні Белдзяржтэатру
АДБУДЗЕЦЦА
УРАЧЫСТЫ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМУ МОПР'у,
прысьвечаны 61-й гадавіне ПАРЫСКАЙ КАМУНЫ І ДНЮ МОПР'у,
з удзелам партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.
Пасьля ўрачыстай часьці—пастаноўка БДТ-1.
Білеты выдаюцца штодзенна ў ГК МОПР'у (Савецкая, 87).
МЕНСКІ ГАРКОМ МОПР'у.

ПРЫ МЕНСКІМ мэдпалітэхнікуму адкрываюцца вячэрнія аднагадовыя КУРСЫ ЗУБНЫХ МЭДСЯСЬЦЁР.
Прыём заяў з 10 па 25 сакавіка штодзенна з 10 гадз. раніцы да 4 гадз. дня ў канцылярыі мэдпалітэхнікуму—Першамайская 7.
Дырэкцыя.

16 сакавіка, у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Дому Чырвонай арміі (вул. Энгельса)
АДБУДЗЕЦЦА
НАРАДА САКРАТАРОЎ ячэек Асоавіяхіму
разам з членамі бюро ячэек оавіяхімічных устаноў
па пытаньні—справаздача Менгарсавету Асоавіяхіму.
Менгарсавет Асоавіяхіму прапануе пад адказнасьць сакратароў ячэек забясьпечыць поўную яўку складу бюро.
Менгарсавет Асоавіяхіму.

КНІГУ НА ДАПАМОГУ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЕ
Цэнтральны магазын „ОГИЗ'а РСФСР"
(Савецкая, 71, тэлефон 8-65)
ПРАВОДЗІЦЬ З УДЗЕЛАМ КАНСУЛЬТАНТАЎ
ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІК
забясьпячэньня арганіз. і індыв. спажыўца пасоўнай і спэц. літаратурай.
Там-жа праводзіцца комплектаваньне бібліятэк па розных пытаньнях.
З 10 па 20 сакавіка магазын адкрыт бесьперапынна з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.
Белдзяржаўнае „ОГИЗ'а РСФСР".

РАБОЧЫ ФАКУЛЬТЭТ Віцебскага вэтэрынарнага вучэбнага камбінату
—абвяшчае—
набор студэнтаў на IV курс вэчарняга рабфаку. Паступаючыя на 4 курс павінны мець веды ў абёме поўнага курсу сямігодкі. Заявы прымаюцца да 23 сакавіка. Іспыты—25 сакавіка.
У першую чаргу прымаюцца рабочыя с 3-гадовым вытворчым стажам, рабочыя саўгасаў і калгасьнікі. Студэнты 4-га курсу забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй 45 руб. у месяц. Дакумэнты прадстаўляюцца, згодна даведніку НКА. Заявы і дакумэнты прымаюцца ў канцылярыі рабфаку—Віцебск, Валадарская, вул., № 58-15.
Дырэкцыя.

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК
даводзіць да ведама ўсіх старшынь каапбюро і каапупаўнаважаных прадпрыемстваў і ўстаноў, што з 15 сакавіка праводзіцца прыём ад каапупаўнаважаных сьпісаў і паявых кніжак пайшчыкаў МЦРК для ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ і выдачы новых.
Прыём сьпісаў і паявых кніжак праводзіцца ў стале пайшчыкаў МЦРК (Калініна № 5) ад 12 гадзін да 7 гадзін вечара.
ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ
даводзіць да ведама ўсіх зачыканых на КУРСЫ, што
ЗАНЯТКІ пачынаюцца 16 III-г.г. у 7 гадзін вечара, у галоўным корпусе, пакой 29.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Даводзіцца да ведама ўсіх курсантаў-заводчыкаў
УСЕБЕЛАРУСКАЙ ЗАВОЧНАЙ САЎПАРТШКОЛЫ
(Гомель) падрыхтоўчага і першага курсаў і райкомаў адпаведных партарганізацый, што на 26 сакавіка г.г., у г. Мазыры склікаецца ўстаноўчая міжраённая канфэрэнцыя завочнікаў УЗСПШ наступных раёнаў: Рэчыцкага, Хойніцкага, Лоеўскага, Уваравіцкага, Буда-Кашалёўскага, Чачэрскага, Церахоўскага, Веткаўскага, Жлобінскага, Крычаўскага, Клімавіцкага, Любанскага, Глускага, Старадарожскага, Слуцкага, Аснавіцкага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага, Бярэзінскага, Касьцюковіцкага, Заслаўскага, Койданаўскага, Гомельскага, Менскага, Бабруйскага, Карміянскага, Чэрыкаўскага, Чырвонаслабодзкага, Старобінскага.
У г. Магілеве склікаецца міжраённая ўстаноўчая канфэрэнцыя завочнікаў УЗСПШ наступных раёнаў: Лагойскага, Смалявіцкага, Плешчаніцкага, Барысаўскага, Бягомльскага, Талачынскага, Лепельскага, Чашніцкага, Сенненскага, Бешанковіцкага, Вушацкага, Дрысенскага, Расонскага, Гарадоцкага, Сураскага, Лёзьнескага, Віцебскага, Яршанскага, Копыскага, Крупскага, Бялыничскага, Магілеўскага, Чавускага, Горацкага, Шклоўскага, Быхаўскага, Полацкага, Грапойскага, Чырвонапольскага, Рагачоўскага, Дубровенскага. Аб тэрміне скліканьня канфэрэнцыі ў Магілеве будзе абвешчана асобна.
Загадчык ЗКС УСПШ Фрэйдлін.

УКРАДЗЕНУЮ
гэрбавую пячатку райашчадкасы № 2761 лічыць несапраўднай.

ВІЦЕБСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае ПРЫЁМ студэнтаў на 1-шы курс.
Умовы прыёму і дакумэнты звычайныя, як і ва ўсе тэхнікумы.
Прыём заяў да 1-га красавіка.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КНІГУ НА ДАПАМОГУ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЕ
ЦЭНТРАЛЬНАЯ КНІГАРНЯ МЕНСКАГА ФІЛІЯЛУ ДВБ
(рог Ленінскай і Савецкай 19-79, тэл. 95)
ПРАВОДЗІЦЬ З УДЗЕЛАМ ЛІТФУНКЦЫЯНАЛАЎ-КАНСУЛЬТАНТАЎ
ДЭКАДНІК
ЗАБЕСЬПЯЧ